№ 29 (531) 9 жніўня 2007

www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

## У НУМАРЫ

**Дырэктарам будуць плаціць болей**

Урад павялічвае дыфэрэнцыяцыю ў аплаце працы. **Старонка 8.**

**ЗША ўзмацняюць санкцыі**

Дзяржэпартамэнт ЗША абмежаваў выдачу візаў для новых катэгорыяў беларускіх чыноўнікаў, а таксама іхных жонак і мужоў. **Старонка 3.**

**Позірк у невядомую краіну**

Часам вобразы эпохі, а часам — гогалеўскія гратэскі. У Дрэздэне адкрываецца выстава Андрэя Лянкевіча. Піша Інго Пэтц. **Старонка 14.**

## Натальля Радзіна: Інтэрнэт выстаіць

**Калі будуць закрытыя апазыцыйныя інтэрнэт-сайты, то людзі сыдуць у блогі. Розьніца толькі ў тым, што блогі, як усё несыстэмнае, заўсёды былі больш радыкальнымі. Старонка 4.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Што рабіць?

Дыскусія пра будучыню. **Старонка 2.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Што рабіць?

2 жніўня, выступаючы на сьвяткаваньні 80-годзьдзя газэты «Советская Белоруссия — Беларусь сегодня», А.Лукашэнка адзначыў, што трэба спыняць «анархію» ў беларускім інтэрнэце. Ён таксама прызнаў поўную непапулярнасьць дзяржаўных рэсурсаў, калі яны знаходзяцца ў стане свабоднай канкурэнцыі зь незалежнымі: «Сярод дзяржаўных сайтаў няма ніводнага з аўдыторыяй больш за пяць тысячаў карыстальнікаў». Ён загадаў стварыць дзяржаўны сайт, каб наведвальнасьць яго была «сотні тысяч».

Ён заявіў трохі загадкава, што «ў той жа час маецца нейкі незалежны інтэрнэт-рэсурс, чыя месячная аўдыторыя ўжо пераўзыходзіць больш чым паўтарамільёнпы тыраж «Советской Белоруссии». Гэта масавы рупар нават не апазыцыі, а рупар варожых нам галасоў, варожых дзяржаваў».

Што меў на ўвазе прэзыдэнт? Калі зьвярнуцца да статыстыкі (akavita.by з карэкцыяй на колькасьць наведваньняў, якія гэты лічыльнік прапускае — каля 20—30%, у залежнасьці ад формы рэсурсу, і на летні спад актыўнасьці), відно, што на сёньня самы папулярны сайт Беларусі ёсьць інфармацыйна-паштовы партал tut.by. Яго пастаянна наведваюць з прыкладна 250 000 IP-адрасоў. Зь іх 86% зь Беларусі. За месяц яго наведваюць усяго з 800 000 IP-адрасоў. Зь іх 81% зь Беларусі. Гэта азначае, што ягонымі паслугамі карыстаюцца ў Беларусі стала каля мільёна чалавек, а час ад часу — каля 2,5 мільёна.

Наступнае месца займаюць рэсурс av.by «Аўта-Малінаўка — Усе прадаваныя аўтамабілі Беларусі». Гэны наведваюць за месяц недзе з 170 000 IP-адрасоў, прыкладна 76% якіх зь Беларусі.

На трэцім месцы «Інфармацыйна-пошукавая сыстэма» date.by (пераважна забаўляльная) зь яе 70 000 IP-адрасоў.

Аднак ніводзін з трох ня ёсьць рупарам і ўвогуле ня мае дачыненьня да бягучай палітыкі.

Калі браць грамадзка-палітычныя рэсурсы, то ў лідэрах на сёньня charter97.org «Хартыя-97» — Навіны зь Беларусі». Яго наведваюць штомесяц з 70 000 IP-адрасоў, 51% зь іх беларускія. Рэгулярна яго наведваюць з 10 000 IP-адрасоў. 64% зь іх зь Беларусі.

Зь ім упоравень ідзе «Белорусский партизан» — 55 000 усяго (66% зь Беларусі), 11 000 сталых (77% зь Беларусі).

Значыць, іх рэгулярна чытаюць унутры Беларусі каля 50 000 чалавек, а нерэгулярна — 150 000 чалавек.

Магчыма, кіраўніку дзяржавы падсунулі ў якасьці лічбы наведнікаў агульную колькасьць праглядаў гэтых рэсурсаў: гэта значыць, колькі разоў былі адкрытыя пэўныя старонкі. У абодвух сайтаў гэтая лічба складае каля мільёна за месяц. Аднак гэта тое самае што лічыць за колькасьць чытачоў газэты агульную лічбу прачытаных у ёй артыкулаў і абвестак.

Зрэшты, справа ня ў гэтым. Харошыя словы прыкрываюць жаданьне абмежаваць свабоду слова цяпер і ў інтэрнэце. Між тым, свабода СМІ, як і свабода выказваньня, — аснова, безь якой немагчымая выбудова ўстойлівай дзяржаўнасьці ў сучаснай Эўропе. Дый для доўгатэрміновага эканамічнага разьвіцьця гэта канечная перадумова.

«Хартыя-97» не хавае таго, што гэта якраз рупар шырокай дэмакратычнай апазыцыі. І як такая заслужыла прызнаньне аўдыторыі. Як ягоная рэдактарка **Натальля Радзіна** зразумела словы А.Лукашэнкі і што яна чакае пасьля іх? Ці вытрымае беларускі інтэрнэт непазьбежную аблогу? Які яго сёньняшні стан і пэрспэктывы? Што ён мае рабіць? Што мае рабіць апазыцыя ўвогуле? Пра гэта зь ёю гутарыць Зьміцер Панкавец **(старонка 4)**.

Гэтым матэрыялам «НН» запачаткоўвае новую рубрыку — «Што рабіць?». У ёй мы будзем зьмяшчаць матэрыялы, якія паказваюць, у якой ступені прадстаўнікі палітычнай апазыцыі (але, пры любой магчымасьці з нашага боку і жаданьні зь іхнага, і прадстаўнікі лукашэнкаўскага лягеру таксама) маюць разуменьне сытуацыі ў краіне, былым Савецкім Саюзе і сьвеце, якія бачаньні будучыні яны маюць, якія прапануюць шляхі дасягненьня таго, што нам бачыцца галоўнай задачай — каб Беларусь заняла «свой пачэсны пасад між народамі», гэта значыць, дасягнула нарэшце поўнай незалежнасьці.

Нам хочацца, каб альтэрнатыўная праграма разьвіцьця краіны набыла канкрэтнасьць ва ўсіх сфэрах. Асаблівую важнасьць мы бачым у тым, каб вузкапалітычныя пастуляты спалучыліся ў ёй з сацыяльна-эканамічнымі, каб яна стала актуальнаю для розных, самых шырокіх групаў насельніцтва. Таксама немалаважна, каб праграма была перафармуляваная з мовы 1980—1990-х гадоў на палітычную мову XXI стагодзьдзя, эпохі пасьля стабілізацыі РБ. У сытуацыі, калі грамадзтва, у тым ліку незалежнае грамадзтва, пад уплывам спажывецтва і пад ціскам рэпрэсій, пагружаецца ў страўсавую абыякавасьць, мы бачым вялікую патрэбу ў дыскусіі пра будучыню.

Запрашаем выказвацца на гэтую тэму ўсіх аўтараў выданьня.

**Шаноўныя людзі!**

«Наша Ніва» шукае распаўсюднікаў для продажу газэты на вуліцах і ў электрычках. Справа выгадная і надта патрэбная.

Продаж ажыцьцяўляецца на аснове дамоваў.

Зьвяртацца праз тэл.:
(017) 284–73–29,
(029) 260–78–32,
(029) 618–54–84.

Купала ў кожны дом




**Выйшаў першы плякат з сэрыі «Нацыянальныя героі Беларусі». Каб набыць, пытайцеся праз тэл. (029) 505-39-11 або праз e-mail: plakat@biz.by**

# Помста камуністам за апазыцыю

Дзейнасьць ПКБ прыпыненая на шэсьць месяцаў.

2 жніўня судзьдзя Вярхоўнага суду Беларусі Ганна Сакалоўская на шэсьць месяцаў прыпыніла дзейнасьць Партыі камуністаў Беларусі (ПКБ). Менавіта на такім пакараньні настойвала ў пазове Міністэрства юстыцыі.

Гэта прывядзе да пераменаў у тактыцы Аб'яднаных дэмакратычных сілаў у 2008 г.

Прадстаўнік Мін'юсту Харытон настойваў на тым, што дзейнасьць ПКБ мусіць быць прыпыненая ў сувязі са шматлікімі парушэньнямі закону аб палітычных партыях. Лідэр ПКБ Сяргей Калякін, які прадстаўляў у судзе інтарэсы сваёй партыі, лічыў, што ўсе парушэньні даўно выпраўленыя і справа мусіць быць закрытая.

Судзьдзя ж цалкам задаволіла пазоў Мін'юсту.

Тэрмін прыпыненьня дзейнасьці партыі канчаецца 2 лютага 2008 г. За гэты час партыі не дазваляецца праводзіць ніякую дзейнасьць. Таксама ПКБ не дазваляецца карыстацца партыйнымі банкаўскімі рахункамі.

Намесьнік старшыні ПКБ Валер Ухналёў мяркуе, што прыпыненьне не адаб'ецца на дзейнасьці партыі. «Хіба толькі нам нельга будзе ад імя партыі рабіць заявы, а ладзіць акцыі мы можам у рамках дэмакратычнай кааліцыі. Шкада толькі, што мы ня зможам вылучаць сваіх сябраў у выбарчыя камісіі», — кажа намесьнік старшыні ПКБ.

«Нават калі заўтра будуць аб'яўленыя парлямэнцкія выбары, то сябры нашай партыі пойдуць на іх праз збор подпісаў», — заявіў С.Калякін. Ён адзначыў, што салідарнасьць з ПКБ выказалі кампартыі Чэхіі, Францыі, Італіі і іншых краін, якія падтрымліваюць шлях Беларусі да дэмакратызацыі.



PHOTO.BYMEDIA.NET

«Прыпынілі дзейнасьць ПКБ, каб не зарэгістраваць Саюз левых партый», — мяркуе в.аб. старшыні БСДП Анатоль Ляўковіч.

Пакуль у левых няма яснага пляну дзеяньня на той выпадак, калі «Саюзу…» будзе адмоўлена ў рэгістрацыі.

Прыпыненьне ПКБ ставіць пад пытаньне выхад газэты «Товарищ», друкаванага органу партыі. Намесьнік галоўнага рэдактара «Товарища» Дзьмітры Яненка зьвяртае ўвагу: «Прыпыненьне дзейнасьці заснавальніка не падстава спыняць выхад газэты. Аднак нам пакуль нічога не вядома, што пра гэта думаюць у Мінінфармацыі».

**Зьміцер Панкавец**

# ЗША ўзмацняюць санкцыі

Дзяржддэпартамэнт ЗША абмежаваў выдачу візаў для новых катэгорыяў беларускіх чыноўнікаў, іх жонак і мужоў.

У сьпісе — афіцэры КДБ і МУС у званьні вышэй за падпалкоўніка, супрацоўнікі ідэалягічных аддзелаў, члены выбарчых камісій.

«Вясной мела месца аслабленьне рэпрэсіўных мераў, але на працягу апошніх тыдняў мы сталі сьведкамі чарговага пагаршэньня сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі», — гаворыцца ў прэс-рэлізе пасольства ЗША. ЗША ў адказ ускладняюць выдачу візаў асобам, што «пагражаюць працэсу пераходу да дэмакратыі ў Беларусі».

Да такіх аднесьлі:

- чыноўнікаў узроўню намесьнікаў міністраў і вышэй;
- генпракурора і ягоных намесьнікаў;
- афіцэраў МУС і КДБ у званьні вышэй за падпалкоўніка;
- супрацоўнікаў ідэалягічных аддзелаў аблвыканкамаў;
- кіраўніка і намесьнікаў кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта;
- членаў Цэнтарвыбаркаму і старшынь абласных выбарчых камісій;
- старшынь абласных і раённых судоў;
- дырэктараў і намесьнікаў дырэктараў дзяржаўных прадпрыемстваў.

Зьвяртае ўвагу, што да сьпісу аднесьлі і мужоў і жанок гэтых асобаў.

На думку палітоляга Віталя Сіліцкага, рашэньне ЗША — дэманстрацыя прынцыпаў пры адсутнасьці моцных рычагоў узьдзеяньня. Ён не чакае ў адказ на крок Вашынгтону помсты беларускіх уладаў на апазыцыі. «Апазыцыю рэпрэсуюць плянава», — мяркуе В.Сіліцкі.

**МБ**

# Прыгодніцкі фільм пра Паўлічэнку?

На конкурсе сцэнароў, праведзеным «Беларусьфільмам», трэцяе месца заняў сцэнар «Крапавы барэт». «Гэта прыгодніцкі фільм, баявік», — кажа аўтар сцэнару Аляксандар Дэбалюк.

У 2003 г. А.Дэбалюк, кіраўнік студыі «Навігатар», прадусаваў карціны Андрэя Кудзіненкі «Акупацыя. Містэрыі».

Першую прэмію на конкурсе сцэнароў атрымала вайсковая драма «Дняпроўскі рубеж» Аляксея Дударава, другую — пасьляваенная драма «Ліда» Лізы Трусевіч.

А.Дэбалюк скончыў Менскую Суворaўскую вучэльню разам з Паўлічэнкам, а пасьля Вышэйшую вайскова-палітычную вучэльню.

**Андрэй Расінскі**

# Натальля Радзіна: Інтэрнэт выстаіць

Калі будуць закрытыя апазыцыйныя інтэрнэт-сайты, то людзі сыдуць у блогі. Розьніца толькі ў тым, што блогі, як усё несыстэмнае, заўсёды былі больш радыкальнымі. На пытаньні «Нашай Нівы» адказвае **Натальля Радзіна**, рэдактарка самага папулярнага беларускага сайту charter97.org «Хартыя» 97 — Навіны зь Беларусі».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Натальля Радзіна**

нарадзілася ў 1979 у Кобрыне ў сям'і вайскоўца. Скончыла журфак БДУ (2001). Працавала журналісткай у газэтах «Имя», «Народная воля», «Наша свабода», «Навіны». У прэс-цэнтры «Хартыі-97» з 2001.

**«Наша Ніва»: Дзіўныя словы Аляксандра Лукашэнкі пра тое, што ў інтэрнэце ёсьць апазыцыйны сайт, наведвальнасьць якога большая за паўмільёнfamous наклад «Беларуси сегодня», гэта не пра «Хартыю-97»?**

**Натальля Радзіна**: Магчыма. Лукашэнка мог казаць пра ўсе беларускія апазыцыйныя інтэрнэт-рэсурсы. Аднак фраза пра інтэрнэт-рупары нейкіх «варожых для Беларусі галасоў» абсалютна не падыходзіць да беларускіх апазыцыйных сайтаў. Мы ня ворагі сваёй радзімы.

Увогуле, сёньня ў беларускай апазыцыі і ўладаў адна мэта — захаваньне незалежнасьці краіны. Болей за тое, апазыцыя прапануе ўладзе дыялёг дзеля эўрапейскага будучага Беларусі. «Варожыя» для Лукашэнкі сёньня прарасейскія СМІ і такія ж палітыкі ў ягоным атачэньні. Таму раю яму быць пільным у гэтым накірунку.

**«НН»: Дзякуючы чаму сайт «Хартыі-97» стаў такім папулярным у беларускім інтэрнэце?**

**НР**: Найперш праз прафэсійную працу тых, хто ім займаецца. Праз жаданьне данесьці праўду да чытачоў, узважаную пазыцыю рэдакцыі. Не пабаюся патэтыкі: і праз любоў да Радзімы, бо для нас на першым месцы стаяць інтарэсы краіны. Да таго ж, мы адзіны беларускі сайт, які мае тры моўныя вэрсіі — беларускую, расейскую і ангельскую.

**«НН»: Ці змогуць улады зрабіць інфармацыйны інтэрнэт рэсурс, якія б параўнаўся па папулярнасьці зь вядучымі незалежнымі парталамі?**

**НР**: Адназначна, не. Наклады друкаваных дзяржаўных выданьняў растуць толькі праз прымусовую падпіску і дзяржаўную дапамогу. У інтэрнэце такі прымус я не ўяўляю. Загнаць наведвальнікаў інтэрнэту на сайт афіцыйнага выданьня, калі там суцэльная прапаганда, немагчыма. Ніякіх адміністратыўных рэсурсаў тут не існуе. Папулярнасьць сеціўных праектаў, зрэшты, як і друкаваных, засноўваецца, найперш, на аб'ектыўнасьці. У той жа «Советской Белоруссии» маленькі рэйтынг у інтэрнэце [яе пастаянна наведваюць з 1,700 IP-адрасоў, 51% якіх зь Беларусі — «НН»]. Уявіць чалавека, які, маючы вакол столькі інфармацыйных парталаў, за-

ходзіць на сайт «СБ», я магу слаба.

**«НН»: А калі блякаваць усе незалежныя сайты?**

**НР**: Заблякаваць «Хартыю» можна на час. Перад выбарамі ўлады так і робяць. Аднак пасьля яны ўсё адно пачынаюць адкрывацца. Нельга заблякаваць увесь інтэрнэт. Хутка разьвіваецца блогавая сыстэма. Калі будуць закрытыя апазыцыйныя інтэрнэт-сайты, то людзі сыдуць у блогі. Розьніца толькі ў тым, што блогі, як усё несыстэмнае, заўсёды былі больш радыкальнымі. Мы ўсё адно будзем працаваць, і нікуды ня дзенецца «Наша Ніва» ці радыё Свабода. Упэўненая, у такім выпадку Беларусь чакаюць таксама жорсткія санкцыі з боку Эўропы і Амэрыкі. Тое, што дазволена Кітаю, ня можа быць дазволена ў Эўропе.

**«НН»: Але калі з падпіскі і шапікаў выкінулі незалежныя газэты, ніякія санкцыі ўведзеныя не былі.**

**НР**: На самой справе, санкцыі былі ўведзеныя, і ўвёў іх сам Лукашэнка. Замежны бізнэс ня хоча ўкладаць грошы ў краіну, у якой зачыняюцца апазыцыйныя газэты, і страты для Беларусі з-за гэтага склалі мільёны даляраў. Сёньня ўвага сьвету да Беларусі калясальная. Палітыка міжнароднай супольнасьці цяпер вельмі кансалідаваная.

Ёсьць і іншае. Закрываць ня выгадна беларускім уладам і з той прычыны, што беларускія чытачы ў пошуках інфармацыі сыдуць на расейскія сайты. А вось расейскія мэдыі, у адрозьненьне ад беларускіх, насамрэч паліваюць брудам Лукашэнку і ягонае атачэньне. Такое ня можа сабе дазволіць напісаць ніводнае беларускае СМІ. Не таму, што баяцца, а таму, што часам — гэта адкрытае хамства і «замова» расейскай улады.

**«НН»: Дык будучыня беларускай інтэрнэт-журналістыкі за блогамі?**

**НР**: Не, я б так не сказала. У блогах людзі кантактуюць, часам таленавіта пішуць, працуюць без рэдактараў, і гэта цудоўна. Аднак людзям таксама патрэбная ўсё ж больш грунтоўная і праверанная інфармацыя. Блогі занадта суб'ектыўныя, каб стаць паўнавартаснымі СМІ. Але канкурэнцыя з боку блогаў будзе адчувацца. У гэтай барацьбе выйграюць тыя сайты, якія пачнуць актыўна супрацоўнічаць з блогерамі.

**«НН»: Ці ўсе беларускія парталы выжывуць пад ціскам уладаў?**

**НР**: Ніхто не загіне. Калі мы засталіся ў Беларусі, ня зьехалі зь яе і абралі прафэсію журналіста, то збочваць паппросту не выпадае. Мая парада: трэба ўвесь час павышаць свой прафэсійны ўзровень. Як гэта рабіць? Раўняцца на сайты сусьветных навінных агенцтваў. Трэба вучыцца ў іх, а не глядзець адзін на аднаго і спрабаваць у нечым пераскакаць. Трэба адразу ставіць высокую планку. Зірніце, што цяпер канкурэнцыя між сайтамі вельмі жорсткая, раней жа яе не было ўвогуле.

**«НН»: Чаго сёньня не хапае беларускім інтэрнэт-выданьням?**

**НР:** Беларускі інтэрнэт хутка разьвіваецца. А патрэбен — прафэсіяналізм. Інтэрнэт — гэта ня тое месца, дзе ўсё дазволена. Тут такія сама правілы, як у друкаваных выданьнях. Тая ж праверка фактаў, розныя жанры, а не банальнае напісаньне чутак. Мы не імкнемся набываць папулярнасьць на «зьлівах» і чутках, адкуль бы яны ні сыходзілі. Але ва ўмовах інфармацыйнай вайны можам адказаць ударам на ўдар.

**«НН»: Але ж закон пра інтэрнэт СМІ яшчэ не прыняты. Гэта не разьняволівае?**

**НР**: Такія законы практычна нідзе і не існуюць. Але трэба ведаць, што рэгістрацыя інтэрнэт-рэсурсаў у цывілізаванай краіне — гэта адно, а ў аўтарытарнай дзяржаве — зусім іншае. Сайтам можна чакаць чаго хочаце, у тым ліку судовых працэсаў, якія адбываюцца супраць папяровых газэт. Падобныя прэцэдэнты ўжо былі, калі журналістаў «Пагоні» судзілі за публікацыі ў інтэрнэце. Андрэй Клімаў знаходзіцца ў ізалятары менавіта за артыкул, разьмешчаны ў інтэрнэце.

Але немагчыма даказаць, што гэты журналіст сам разьмясьціў інфармацыю на тым ці іншым сайце. Трэба ведаць сыстэму працы інтэрнэт-рэсурсаў. Беларускія журналісты ніколі самі не разьмяшчаюць інфармацыю ў інтэрнэце. Увогуле, магу сказаць, што «Хартыя'97» — міжнародны сайт.

**«НН»: Якія пэрспэктывы чакае беларускі інтэрнэт? Як ён будзе выглядаць, скажам, праз пяць гадоў?**

**НР**: Папулярнасьць і ўплыў інтэрнэту расьце ва ўсім сьвеце. Беларусь тут не выключэньне. З кожным годам усё больш людзей у краіне маюць вольны доступ да інтэрнэту, а гэта значыць да свабоднай і незалежнай інфармацыі. Роля інтэрнэту ў Беларусі вялізарная, па самай простай прычыне, бо не засталося іншых крыніц праўдзівай інфармацыі. Фактычна, не засталося незалежных газэт, няма тэлебачаньня, радыёстанцый. Разам з тым, я перакананая, што праз пяць гадоў у краіне будзе абсалютна іншая палітычная і мэдыйная сытуацыя. У нас будуць і нармальныя друкаваныя выданьні, і электронныя. У гэтым я перакананая. Інтэрнэт таксама зробіць вялікі крок наперад. Бо гэта самая дынамічная інфармацыйная прастора.

**Гутарыў Зьміцер Панкавец**

## АПЫТАНЬНЕ НА NN.BY

### Лукашэнка заявіў пра неабходнасьць «спыніць анархію ў інтэрнэце». Як, па-Вашаму, пачнуць блякаваць сайты?

| | |
|---|---|
| так | 36 (20,6%) |
| не | 14 (8,0%) |
| ня толькі блякаваць, але і фільтраваць | 61 (34,9%) |
| кішка танка | 64 (36,6%) |

Усяго прагаласавала 175

## СЬЦІСЛА

### Расейская журналістка зноў заклікае ўвесьці войскі ў Беларусь

Камэнтатарка інтэрнэт-выданьня gazeta.ru Юлія Латыніна зноў заклікае ўвесьці войскі ў Беларусь для абароны інтарэсаў «Газпрому». «Палітыка беларускага прэзыдэнта несяброўская Расеі; учынкі выходзяць за рамкі міжнароднага права, а выказваньні — за рамкі прыстойнасьці. Міжнароднай легітымнасьці ён ня мае. Плян вайны супраць Беларусі патрэбны, як агнягасьнік у хаце».

Ю. Латыніна — вядомая журналістка, крытык Пуціна. Свае прапановы яна падае нібыта жартам, але ад такіх сьмешачак мароз па скуры.

### Мытня і памежнікі станудь адным акном

Кіраўнікі мытнага і пагранічнага камітэтаў абмеркавалі пытаньні спрашчэньня кантролю ў пунктах пропуску. Мае быць уведзены прынцып «адно спыненьне», прычым нагляд мае быць такі, каб пасажырам ня трэ было высядаць з транспартнага сродку.

**МБ**

# Выхад кнігі, выхад з турмы

7 жніўня ўвечары, пасьля адбыцьця 15 сутак адміністрацыйнага арышту, выйшлі на волю Павал Севярынец, Аляксей Шэін і Аляксандар Чарнышоў. Таксама выйшаў на волю моладзевы актывіст Сяргей Клюеў, які атруціўся на Акрэсьціна турэмнай ежай і нейкі час прабыў у шпіталі.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Севярынец і Шэін былі затрыманыя 23 ліпеня недалёка ад станцыі мэтро «Пушкінская». У палітыкаў знайшлі некалькі дзясяткаў улётак, прысьвечаных 17-й гадавіне прыняцьця Дэклярацыі аб дзяржаўным сувэрэнітэце. Суд за гэта прыгаварыў Севярынца і Шэіна да 15 сутак арышту. Хлопцам інкрымінавалі арт. 23.24 новага Адміністрацыйнага кодэксу: заклікі да правядзеньня несанкцыянаванай акцыі.

Сустрэць палітвязьняў да Акрэсьціна прыйшло каля сарака чалавек. Хлопцы павінныя былі выйсьці а 20.30, але людзі нашыя вучаныя, таму сабраліся пад мурамі спэцпрымальніка-разьмеркавальніка загадзя. Так і выйшла: адпусьцілі раней на гадзіну.

Зь вядомых людзей прыйшлі палітыкі Аляксей Янукевіч, Аляксей Міхалевіч, актывіст Руху «За Свабоду» Аляксей Кавалец, палітоляг Алесь Лагвінец. Было багата журналістаў, маладафронтаўцаў. Зь Віцебску прыехала маці Паўла Севярынца Тацяна.

Шмат хто быў з кветкамі. Сябры Аляксандра Чарнышова віталі яго з плякатам, дзе павіншавалі маладзёна з днём нараджэньня, якое хлопец сустрэў на Акрэсьціна.

Амаль адразу Севярынцу ўручылі кнігу «Лісты зь лесу», што выйшла на днях у сэрыі «Кнігарня «Наша Ніва». Для Паўла гэта быў сапраўдны сюрпрыз, бо вестку пра выхад кнігі яму яшчэ ніхто не перадаў. Севярынец адразу стаў раздаваць прысутным аўтографы. Праз тыдзень ён абяцае зладзіць паўнавартасную прэзэнтацыю ў Менску.

На сутках Павал, Аляксей і Аляксандар сядзелі ў розных камэрах. Разам з Паўлам у камэры з палітычных сядзеў толькі Юры Вольфсан, які ў аўторак таксама прыйшоў да брамы спэцпрымальніка. Севярынец кажа, што разам зь ім таксама сядзеў сталы чалавек, які меў адкрыта фашыстоўскія погляды і выказаў іх усім сукамэрнікам. «Ён заклікаў зьнішчыць усіх габрэяў, пры гэтым спаў паміж Юр'ем Вольфсанам і Ўладзімерам Відэрманам. Было крыху сьмешна. Пры гэтым дзядзька стала слухае радыё Свабода і добра ведае, што робіцца ў апазыцыйным лягеры. Мяне інакш, як здраднікам, ён не называў».

Павал расказвае, што да яго ў камэру некалькі разоў прыходзіў нейкі капітан, які нават не прадстаўляўся, але хацеў паразмаўляць наконт дзейнасьці Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі. Севярынец адмаўляўся.

Аляксей Шэін паказваў малюнкі, які ён зрабіў у Акрэсьціна. Сьмяяўся, што маляваў іх яшчэ да таго, як яму перадалі «Нашу Ніву» зь дзёньнікам Алеся Каліты.

Агулам сустрэча палітвязьняў працягнулася больш за гадзіну. Міліцыянты, якія дзяжурылі недалёка, ніяк не рэагавалі.

**Зьміцер Панкавец**

## СЬЦІСЛА

### Толькі 44 студэнты на Праграму Каліноўскага

Камітэт абароны рэпрэсаваных «Салідарнасьць» рэзка зьменшыў колькасьць асобаў, якія будуць рэкамэндаваныя да навучаньня ў Польшчы. Летась такіх было 270, сёлета — толькі 44. Крытэры адбору сталі стражэйшымі. Праграма задумвалася для абароны юнакоў і дзяўчат, выключаных па палітычных матывах зь беларускіх ВНУ.

### Зварот у абарону Шылы, Грышчэні, Азаркі

Мілінкевіч, Барадулін, Вячорка, Скрабец, Міхалевіч, Кулей, Мазынскі, Содаль, а таксама шэраг былых палітвязьняў, жанчынаў і вэтэранаў падпісалі зварот у падтрымку юнакоў і дзяўчат, супраць якіх рыхтуюць новую справу за прыналежнасьць да незарэгістраванай патрыятычнай арганізацыі «Малады фронт». Аўтары звароту называюць юнакоў «сьветлымі, адукаванымі і таленавітымі» і заклікаюць сьвядомых грамадзян усяляк падтрымліваць рэпрэсаваных юнакоў. Поўны тэкст і сьпіс падпісантаў можна знайсьці на сайце nn.by.

**15 жніўня**, на двухгодзьдзе высылкі Паўла Севярынца ў Малое Сітна, **ва Ўправе БНФ** (вул.Варвашэні, 8) пройдзе прэзэнтацыя кнігі «Лісты зь лесу». **Пачатак а 18-й.**




**Павал Севярынец. Лісты зь лесу.** — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2007. — 314 с. — (Кнігарня «Наша Ніва»).

# Зубрыце прамовы Лукашэнкі

У Акадэміі кіраваньня прамовы прэзыдэнта ўключылі ў экзамэнацыйныя пытаньні для паступаючых.

Айчынная паліталёгія вяртаецца да савецкіх часоў. Ідэалягічныя пытаньні займаюць усё большае месца ў навучальных праграмах па прадмеце. Некалі савецкія грамадазнаўцы вывучалі па працах генэральных сакратароў пытаньні навуковага камунізму. Сёньня ў дзяржаўнай кузьні кадраў — Акадэміі кіраваньня — вывучаюць выступы прэзыдэнта.

Вось прыклады экзамэнацыйных пытаньняў з «Дапаможніка-даведніка для паступаючых у асьпірантуру» (Аўт.-склад. В.Крыўцоў, Л.Мядзьведзева. — Менск: Акадэмія кіраваньня пры прэзыдэнту Рэспублікі Беларусь, 2006. — 96 с.). Адкрыем сьпіс для спэцыяльнасьці 23.00.01 «Тэорыя палітыкі, гісторыя і мэтадалё-гія палітычнае навукі» (с.70—72):

Пытаньне №28 — «Недзяржаўныя інстытуты ў палітычнай сыстэме. Выступ Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі на пятым зьездзе Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі 20.09.2005». Пытаньне № 32 — «Грамадзкія аб’яднаньні і рухі. Выступ прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь на 39-м зьезьдзе БРСМ 23.09.2005». Пытаньне № 58 — «Месца Рэспублікі Беларусь у зьменлівай палітычнай структуры сьвету. Выступ А.Р.Лукашэнкі на 60-й сэсіі Генэральнай Асамблеі ААН 15.09.2005». Пытаньне № 60. — «Пасланьне А.Р.Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу (2006)»

Ведаць прэзыдэнцкую мудрасьць павінныя і будучыя асьпіранты іншых спэцыяльнасьцяў. У сьпісах літаратуры да пытаньняў таксама поўна ідэалягічных крыніцаў. Цікава, што ў экзамэнацыйныя пытаньні трапілі толькі чатыры згаданыя прамовы.

Відаць, яны, на думку ўкладальнікаў, носяць унівэрсальны і вечны характар. Паводле выступу прэзыдэнта на Генасамблеі ААН, трэба разглядаць ня толькі месца Беларусі ў сьвеце, але і такія пытаньні, як «Праблемы глябалізацыі і розныя аспэкты гэтага працэсу», а таксама «Глябальныя праблемы сучаснасьці. Сутнасьць і крытэры вылучэньня» (у абодвух выпадках другая частка пытаньня — гэта згаданы выступ).

Сыстэматычнасьці вывучэньне творчасьці прэзыдэнта ня мае — выкарыстоўваюцца толькі чатыры выступы, дый тое тры зь іх падазрона блізкія па часе адзін да аднаго.

Небясьпечна, што такія экзамэнацыйныя пытаньні ўвогуле складзеныя, зацьверджаныя і выкарыстоўваюцца. Справа ня ў стаўленьні да прэзыдэнта, але ў *навуцы*.

Выступы прэзыдэнта ня могуць быць заменай навуковых працаў па паліталёгіі. Мы бачым рэцыдывы савецкай сыстэмы адукацыі, таталітарнай і кан’юнктурнай.

Сумленны навуковец не дазволіць сабе дапасоўваць сваю акадэмічную дзейнасьць да неакадэмічных мэтаў. Калі ў краіне зьяўляюцца гатовыя да таго людзі, гэта азначае заняпад навукі. А ўрэшце і самой дзяржавы. Калі штукарствы магчымыя ў паліталёгіі, значыць, яны могуць мець месца і ў іншых навуках. І там страты, як мы ўжо ведаем з савецкіх часоў, могуць быць куды большымі — сьмерцяносныя сьвінакомплексы, небясьпечныя АЭС.

Такое стаўленьне да навукі выракае на правал мадэрнізацыйныя намаганьні рэжыму, бо мадэрнізацыя — гэта рацыянальнасьць і навука. Не вывучэньне прамоваў правадыроў. Парк высокіх тэхналёгіяў не збудуеш на цытатніках.

**Сяргей Богдан, Маладэчна**

# Булгакаў: «Белтрансгаз» — як Брэсцкая крэпасьць

«Мэта Крамля — ня проста рэгулярная выплата грошай за пастаўкі газу ў Беларусь, а дасягненьне стратэгічнага кантролю над энэргетычнай сыстэмай, найперш над «Белтрансгазам».

«Лукашэнка ўпершыню публічна заявіў, што за гэтым эпізодам з пастаўкамі газу крыецца шырэйшая расейская стратэгія ўсталяваньня кантролю над беларускай эканомікай. «Белтрансгаз» зьяўляецца своеасаблівай Брэсцкай крэпасьцю — калі яе здаць, то за гэтым пачнецца неабарачальная здача ўсіх стратэгічна важных аб’ектаў беларускай эканомікі».

«Расейцы перабольшваюць нядзольнасьць лукашэнкаўскага рэжыму камунікаваць зь міжнароднай супольнасьцю. Яны выходзяць з таго, што беларускі рэжым прысуджаны быць павернутым толькі на Ўсход».

**Радыё Свабода, «Праскі акцэнт»**

# Віртуальная партызанка

Улады Беларусі зьнішчылі незалежную прэсу, але яны ня змогуць цалкам апанаваць інтэрнэт. Піша **Аляксандар Класкоўскі**.

Як хутка і якіх менавіта чакаць заканадаўчых захадаў, скіраваных на ўтаймаваньне «анархіі ў інтэрнэце»?

Узьдзейнічаць можна або на самі сайты, або на людзей, што робяць гэтыя сайты.

Блякаваньне рэсурсаў лёгка абысьці праз усялякія проксі-сэрвэры ды ананімайзэры.

Можна загнаць у стойла рэгістрацыі рэсурсы, што напампоўваюцца кантэнтам у самой Беларусі. Але і тут мяжа ўмоўная. Згадайце, калі спрабавалі прысьцябацца да сайтаў некаторых партыяў, то іх лідэры, хоць і ня злазяць з тых ўэб-бачынаў, артыстычна разводзілі рукамі: ніякага юрыдычнага дачыненьня ня маем, сайт робяць нашы невядомыя прыхільнікі з Гвадэлупы.

Пляны экспансіі дзяржаўнай журналістыкі ў сеціва? Так, але канкураваць на роўных зь непадцэнзурнай плыньню кіраваная дзяржаваю прэса нядзольная. Пакуль вядоўца казённага псэўдаблогу ўзгодніць з аддзелам ідэалёгіі адзін постынг, нейкі адвязаны Лёлік ці Болік намалоціць тузін зьедлівых гітоў.

Дроў у сеціве нашы мудрыя дзеячы наламаць могуць, але татальнай перамогі не атрымаюць. А ўжо сусьветнай славы ім будзе па самыя вушы.

# Дырэктарам будуць плаціць болей

Урад узьняў каэфіцыенты суадносінаў сярэдніх заробкаў кіраўнікоў і работнікаў шэрагу заводаў. Пра гэта гаворыцца ў пастанове Савету міністраў № 976 ад 31 ліпеня.

На павышаныя заробкі могуць разьлічваць цяпер дырэктары наступных прадпрыемстваў Міністэрства прамысловасьці: Беларускі мэталюргічны завод, БелАЗ, МТЗ, МАЗ, Маторны завод, «Гомсельмаш», Магілёўскі завод ліфтавага машынабудаваньня, «Атлянт» (усе 6,0), Магілёўскі мэталюргічны завод (5,5).

Гэта значыць, што яны будуць мець права атрымліваць заробак, у гэтульки разоў большы за сярэдні па заводзе. Калі сярэдні заробак на МТЗ складае 700 тысяч рублёў, то дырэктар можа разьлічваць на 4,200,000.

На прадпрыемствах Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва каэфіцыентам 6,0 узнагароджаныя начальнікі ААТ «Бярозабудматэрыялы», ААТ «Красносельскбудматэрыялы», ААТ «Салігорскпрамбуд» і ВРУП «Беларускі цэментны завод».

У канцэрне «Беллегпрам», дзе эканамічная сытуацыя не такая радасная, як у прамысловасьці будматэрыялаў ці машынабудаваньні, на каэфіцыент 5,5 заслужыліся кіраўнікі СТАА «Белвест», ААТ «Белфа», ААТ «Віцебскія дываны», ААТ «Сьвітанак».

Падобнае рашэньне прымалася і ў 2006 годзе, але сьпіс прадпрыемстваў пашырыўся.

Гэтае рашэньне лабіраваў віцэпрэм'ер Уладзімер Сямашка, нефармальны лідэр беларускага дырэктарату. Мяркуецца, што яно павысіць матывацыю мэнэджэраў і зьнізіць схільнасьці да карупцыі. Таксама яно дазоліць спыніць вымываньне кіраўнічых кадраў зь дзяржаўнага ў прыватны сэктар. Зь іншага боку, яно выяўляе тэндэнцыю на большае расслаеньне грамадзтва.

**Мікола Бугай**

## СЬЦІСЛА




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

### Зноў падаражэў бэнзін

Кошты на паліва вырасьлі ў сярэднім на 4,7%. Гэта пятае падаражэньне паліва за год.

### Найніжэйшыя заробкі — у Карме й Хоцімску

Як сьведчыць афіцыйная статыстыка, у чэрвені сярэдні заробак у краіне склаў 710,2 тыс. рублёў, а ў бюджэтнай сфэры — 642,9 тыс. рублёў. Толькі ў двух раёнах (Кармянскім і Хоцімскім) сярэдняя зарплата так і ня выйшла на ўзровень 200 даляраў.

### Кожны беларус трымае ў банках каля мільёна рублёў

На 1 ліпеня на кожнага беларуса прыпадае 955 тысяч на банкаўскіх укладах. За год гэтая лічба вырасла на 35%.

**МБ**

**На фоне росту сусьветных цэнаў на збожжа на 20% беларускія сяляне някепска заробяць. Год быў удалым для зерневых. Збор збожжа ў Беларусі складзе каля 6,8 мільёна тонаў — адзін з найлепшых вынікаў у гісторыі.**

**АЛЕЙНІК СУДЗІЦЦА. Менскі гарадзкі суд пад старшынствам Міхаіла Басава цалкам задаволіў прыватную скаргу былога студэнта Акадэміі кіраваньня пры прэзыдэнту Юр’я Алейніка. Студэнт-выдатнік быў адлічаны з 4-га курсу Акадэміі 15 траўня 2007 году нібыта за прагулы. Аднак Юры Алейнік лічыць, што сапраўдная прычына адлічэньня — яго грамадзянская пазыцыя і палітычныя погляды. Паводле рашэньня Менгарсуду, справа Юр’я Алейніка вяртаецца зноў на разгляд у суд першай інстанцыі.**



PHOTOBYMEDIA.NET

## 31 ліпеня

### Прысудзілі, але не пакаралі

Аляксандар Дзямешчык, судзьдзя Смургонскага раёну, вынес пастанову па адміністрацыйнай справе ў дачыненьні да грамадзкага актывіста **Ўладзімера Шульжыцкага**. Хлопец абвінавачваўся ў тым, што 24 красавіка 2007 году каля 18 гадзін, выходзячы разам зь міліцыянтамі з пад’езду дому па вул.Юбілейнай у Смургонях, нецэнзурна лаяўся. Судзьдзя ў сваім рашэньні канстатаваў, што віна Ўладзімера Шульжыцкага ў хуліганстве пацьверджаная, але ў сувязі з заканчэньнем 3-месячнага тэрміну для прыцягненьня да адказнасьці за адміністрацыйнае правапарушэньне ён справу спыняе.

## 1 жніўня

### «Вясна» рэгіструецца

Група праваабаронцаў падала ў Міністэрства юстыцыі дакумэнты на рэгістрацыю **грамадзкага праваабарончага аб’яднаньня «Вясна»**. Арганізацыя зьяўляецца пераемніцай праваабарончага цэнтру «Вясна», які быў ліквідаваны Вярхоўным судом у кастрычніку 2003 году.

### Памяці зьніклых

А 9 гадзіне вечару ў падземным пераходзе каля станцыі мэтро «Інстытут культуры» ладзіўся ланцуг неабыякавых людзей. Моладзь стаяла з партрэтамі зьніклых палітыкаў.

### За адну налепку

Сябра Партыі БНФ **Сьцяпана Сьвідзерскага** пастановаю адміністрацыйнай камісіі Ленінскага раёну Горадні аштрафавалі на 4 базавыя велічыні. Хлопца абвінавацілі у тым, што ён наляпіў адну (і гэта зафіксавана ў пратаколе) налепку на сьцяну будынку.

## 2 жніўня

### Італьянцы пра Чарнышова

У рамках сэрыі музычных вечароў у італьянскай правінцыі Казэрта музыкі прысьвяцілі свой выступ беларускаму моладзеваму актывісту **Аляксандру Чарнышову**, які сустрэў свой дзевятнаццаты дзень нараджэньня ў спэцпрыёмніку-разьмеркавальніку на Акрэсьціна.

### Пакаралі штрафамі

Суд Ленінскага раёну Менску аштрафаваў моладзевых актывістаў апазыцыі **Яню Карповіч, Сержука Палаўкова і Артура Дасанава** на дзьве базавыя велічыні (62 тыс. руб.). Іх затрымалі на прыватнай кватэры 1 жніўня ўвечары. Ноч усіх трымалі ў міліцыі, а раніцай склалі пратаколы нібыта за нецэнзурную лаянку.

### Выйшлі на волю

На волю са спэцпрыёмніку-разьмеркавальніку па Акрэсьціна выйшлі актывісты моладзевага руху — **Сяргей Клюеў, Валянцін Сакалоўскі і Аляксей Бондар**.

### Каб не траплялі ў псыхушкі

**Міжнародная асацыяцыя абароны правоў чалавека** выступіла ініцыятарам стварэньня ў Беларусі незалежнай псыхіятрычнай экспэртызы.

## 3 жніўня

### Каліта патрабуе кампэнсацыі ад мытні і КДБ

Моладзевы лідэр **Алесь Каліта** падрыхтаваў пазоў у суд аб спагнаньні з супрацоўнікаў ашмянскай мытні і КДБ матэрыяльнага ўрону, які актывіст атрымаў па прычыне наўмыснага пашкоджаньня яго ноўтбуку. Яшчэ ў студзені пры перасячэньні беларуска-літоўскай мяжы ў Каліты канфіскавалі ноўтбук, вярнулі больш чым праз паўгоду. Прычым, зламаны. Нанесены ўрон у суме 321 тыс. рублёў.

### Летнік пад Валожынам

Раніцай супрацоўнікі Валожынскага РУУС і раённай санэпідэмстанцыі зьявіліся ў **намётавым лягеры ля ракі Ісلач** на Валожыншчыне, дзе адпачывалі прадстаўнікі дэмакратычных моладзевых арганізацый. Яны загадалі моладзі згарнуць лягер. Пасьля праверкі пашпартоў дзяўчыну і накалькі юнакоў міліцыянты затрымалі і даставілі ў Валожынскі РУУС. Затым, пасьля перамоваў з начальствам, усіх адпусьцілі, але папярэдзілі, каб хутчэй пакінулі тэрыторыю раёну.

### Міліцыя з народам

Актывісты кампаніі «Джынс за Свабоду!» правялі акцыю каля аднаго з апорных пунктаў міліцыі ў Фрунзэнскім раёне Менску. На электрычных дратах насупраць апорнага пункту быў вывешаны бел-чырвона-белы сьцяг, а на сьцяне аднаго зь дзевяціпавярховых дамоў — **расьцяжка «Міліцыя — з народам!»**

## 4 жніўня

### Міжнародная салідарнасьць

**Міжнародная Федэрацыя Правоў Чалавека (FIDH)** выказала найвялікшую заклапочанасьць хваляй адвольных арыштаў і затрыманьняў актывістаў апазыцыі напярэдадні 27 ліпеня 2007.

### У Эўропу!

На Магілёўскай трасе кіроўцы аўтамабіляў маглі назіраць за цікавай акцыяй. Дваццаць маладых людзей з таблічкамі **«У Эўропу»** сталі ў калёну. Завяршаў калёну новы дарожны знак: зьверху было напісана «Эўропа», знізу «BY», а пасярэдзіне быў намаляваны сымбаль развароту на 180 градусаў.

## 6 жніўня

### Перамога донараў

Магілёўскія донары дамагліся першай перамогі ў справе вяртаньня скасаваных ільготаў. Па словах актывіста, ганаровага донара **Ігара Каваленкі**, Савет міністраў вырашыў пакінуць донарам 40-працэнтную надбаўку да пэнсіі.

### Прадпрымальнікі на плошчы

150 прыватных прадпрымальнікаў выйшлі на галоўную плошчу Сьветлагорску да будынку райвыканкаму. Яны пратэставалі супраць дзеяньняў міліцыянтаў і мясцовай падатковай службы, якія часта канфіскоўваюць тавар.

### Зноў затрыманьні

Супрацоўнікі міліцыі Ленінскага раёну Менску 5 жніўня затрымалі двух актывістаў Аб’яднанай грамадзянскай партыі — **Арцёма Дараўскага і Аляксандра Сергіенку**.

У іх заплечніках знайшлі газэты «Свабоду Беларусі». Пасьля складаньня пратаколаў усе 400 экзэмпляраў газэты былі канфіскаваныя. Юнакоў зьнялі на відэа і ўзялі адбіткі пальцаў. Пасьля трох гадзін затрыманьня яны былі адпушчаныя.

ЗП

# Дурная бясконцасьць

Цяжка падмануць наскрозь бізантыйскую дзяржаву бізантыйскімі мэтадамі. Пра прыроду газавых крызісаў піша **Віталь Тарас**.

### Мадэль паводзінаў

Чарговае паведамленьне пра чарговае абвастрэньне канфлікту ўладаў Беларусі з расейскім Газпромам выклікае ў памяці панятак «дурной бясконцасьці». Кожнага разу «абвастрэньне» працякае паводле адной і той схемы. Раптам (!) становіцца вядома, што РБ завінавацілася Газпрому (альбо Раснафце) і ня хоча ў поўным аб’ёме плаціць за пастаўленую з Расеі сыравіну. Газпром, нечакана (!) для беларускага боку, абвяшчае ўльтыматум. У Маскву едуць па чарзе кіраўнік ведамства альбо міністар, потым віцэ-прэм’ер альбо прэм’ер-міністар. У апошні момант афіцыйны Менск ідзе на пэўныя саступкі. Пасьля чаго Масква абвінавачваецца ў памкненьні прыватызаваць Беларусь, а расейскія манапалісты — у несумленнасьці й хціvасьці.

Кожнага разу палітычныя акцыі кіраўніка Беларусі, ягоная папулярнасьць у народзе толькі яшчэ больш растуць. Ён зноў і зноў падкрэсьлівае, што незалежнасьць краіны ня здасьць. Апазыцыя таксама заўсёды не забываецца выказацца на гэтую тэму, каб падкрэсьліць, што і яна, апазыцыя, як і кіраўнік дзяржавы, за незалежнасьць. За Беларусь.

Потым цыкл паўтараецца. І падчас кожнага цыклу надыходзіць час, калі актывістаў апазыцыі пачынаюць хапаць за арганізацыю нават самых нязначных акцыяў пратэсту, папаўняючы турмы і пасяленьні новымі палітзьняволенымі.

Паміж гэтым, здаецца, няма ніякай сувязі. Незалежнасьць — сама па сабе, палітыка й правы чалавека — самі па сабе. (Амаль паводле славутай формулы пра мух і катлеты). Высокі панятак ператвараецца ў свайго роду сьвятарную карову. Калі кіраўнік дзяржавы або яго падначаленыя пачынаюць гаварыць пра незалежнасьць, усе крытыкі рэжыму імгненна замаўкаюць альбо пачынаюць гаварыць аб неабходнасьці падтрымаць рэжым у справе абароны дзяржаўнага сувэрэнітэту ад расейскага імпэрыялізму, згуртавацца вакол лідэра.

Магчыма, у цяперашняй сытуацыі такая мадэль паводзінаў многім падаецца адзіна слушнай. Калі роднаму дому пагражае небясьпека звонку — не да сварак у доме. Але ніякая, нават самая страшная небясьпека, не пазбаўляе тых, над кім яна навісла, абавязку думаць. Нават наадварот, у момант найбольшай небясьпекі выратоўваюць ня крыкі «Караvул!» альбо «Ратуйце, хто можа!», але крытычны погляд на сытуацыю і яе аналіз. Чым менш часу на роздум — тым больш строгім і хуткім павінен быць аналіз. Найперш — уласных паводзінаў.

Аналізу, прынамсі, у прэсе, акурат і не хапае. Дакладней, ён зводзіцца ды высноваў, сэнс якіх лёгка ўмяшчаецца ў сэнтэнцыю «Расея хоча нас прыватызаваць». Такое адкрыцьцё, аднак, не адказвае на пытаньне — як гэтаму процістаяць? Як захаваць дзяржаўную незалежнасьць? Што канкрэтна можа зрабіць вораг з аб’ектам сваіх памкненьняў і што гэты аб’ект (то бок мы) можа зрабіць?

### Абхітрыць Бізантыю

Нават у самым запаленым мозгу наўрад ці можа нарадзіцца сцэнар вайсковага нападу Масквы на свайго хаўрусьніка. (Як і наадварот — нападу танкавых дывізіяў НАТА на Маскву праз тэрыторыю Беларусі). Праўда, калі гаворка вядзецца аб Расеі, нельга выключыць і самыя фантастычныя варыянты падзеяў. Прынамсі, новы закон аб наданьні расейскім энэргетычным кампаніям-гігантам права мець уласныя вайсковыя фармаваньні для абароны сваіх трубаправодаў, у тым ліку на замежнай тэрыторыі, прымушае задумацца.

Тым ня менш пагроза расейскай акупацыі сёньня ўсур’ёз нікім не абмяркоўваецца. За невялікім выключэньнем — ёсьць тыя, хто заяўляе, быццам Беларусь ужо жыве ва ўмовах акупацыі. Але ці варта баяцца страты незалежнасьці тым, хто ўжо сёньня лічаць сябе «акупаванымі»?

Размова ідзе, натуральна, пра эканамічную экспансію Расеі, спробы расейскіх манаполіяў завалодаць у Беларусі ўласнасьцю, паколькі і пакуль яна здольная прыносіць прыбытак. І хаця гэтыя спробы робяцца самым нахабным спосабам, з пазыцыі сілы, яны ўсё-такі маюць пакуль негвалтоўны, эканамічны характар.

Калі нам кажуць, што ва ўраду Беларусі няма выйсьця, што Газпром і Крэмль вядуць несумленную гульню, прыпіраючы кіраўніцтва да сьценкі, шантажуючы яго, узьнікае пытаньне — а чаму кіраўніцтва дапусьціла такую сытуацыю ў прынцыпе? Не, гаворка не пра тое, што Крэмль трэба было неяк падмануць, весьці супраць яго нейкую больш хітрую гульню, больш гнутка весьці перамовы і г.д. Спрабавалі не аднойчы, у мэтадах не саромеючыся… Ня выйшла. Цяжка падмануць наскрозь бізантыйскую дзяржаву бізантыйскімі мэтадамі.

Пытаньне ў тым, чаму эканоміка сувэрэннай краіны апынулася перад такой незайздроснай альтэрнатывай — альбо расейская сыравіна альбо сьмерць? Ці скажам мякчэй — эканамічны каляпс. Паводзіны расейскага кіраўніцтва, якое абвясьціла сваю краіну вялікай энэргетычнай дзяржавай, ужо даўно былі цалкам прадказальнымі. Яно паводзіць сябе натуральна. Спрабуючы атрымаць максымальную выгаду ад высокіх цэнаў на энэрганосьбіты, яно ня робіць вялікай розьніцы паміж варожымі Польшчай, Грузіяй, Эстоніяй і братняй Беларусьсю. Менавіта і

толькі таму, што Беларусь ня ёсьць часткай Расеі, а ёсьць сувэрэннай дзяржавай. Гэта факт. Ці застанецца яна незалежнай — залежыць, прабачце за таўталёгію, ад многіх фактараў.

## Паміж двума крэсламі

Доўга заставацца ў становішчы паміж двума крэсламі — РБ як быццам частка саюзнай дзяржавы, а ў той самы час нібыта й не — немагчыма было. Што й зрабілася цалкам відавочным падчас апошняга газавага канфлікту. Было б зразумела, калі б час, страчаны на гульні ў інтэграцыю з Расеяй, быў выкарыстаны на пошук сапраўднай альтэрнатывы. Няўжо Беларусь, зь яе сапраўды высокакваліфікаванай інтэлектуальнай рабочай сілай не магла б зрабіцца яшчэ адным «усходнеэўрапейскім тыграм» у эканоміцы — накшталт Славаччыны, напрыклад?

Можна назваць гэта разважаньнямі пра немагчымае. Бо мы жывём у зусім іншай палітычнай рэальнасьці, чым краіны Эўразьвязу. Але тут акурат мы і ўпіраемся ў тое самае пытаньне аб незалежнасьці як найвышэйшай дзяржаўнай каштоўнасьці. Ці можна сёньня сказаць, што кіроўныя эліты Беларусі цягам апошняга дзесяцігодзьдзя дбалі менавіта пра яе незалежнасьць? Калі б было так, дык яны павінныя былі б паклапаціцца найперш пра стварэньне зусім іншага эканамічнага клімату для айчынных прадпрыемстваў, пра разьняволеньне грамадзтва, пра стварэньне іншага, больш прывабнага іміджу краіны на Захадзе. Не хапіла палітычнай волі, адукацыі, інтэлекту? Дык ці такая эліта заслугоўвае права называцца нацыянальнай? Ці здольная яна ўвогуле абараніць незалежнасьць?

Што ж аказалася ў «загашніку» ў сёньняшняй лукашэнкавай Рэспубліцы Беларусь? Золатавалютная рэзэрва Нацбанку? А ці надоўга яго хопіць, калі газ будзе каштаваць 250 даляраў за кубамэтар? А такая пэрспэктыва ўжо вельмі блізкая. Што яшчэ — заём у Вэнэсуэлы? Дружба з арабскімі краінамі, з Кітаем?

Магчыма, гэты скепсыс для спэцыялістаў выглядае дылетанцкім і неабгрунтаваным. Але хацелася б, каб мяне і мільёны маіх суайчыньнікаў у гэтым пераканалі. Каб з намі гаварылі пра першаступенныя праблемы, а не адмахваліся, як ад мухаў, пакуль «дзяржаўныя мужы» ў нейкіх завоблачных вышынях (альбо ў крамлёўскіх калідорах) вырашаюць лёс Беларусі.

Між іншым, у прэамбуле беларускай Канстытуцыі напісана «мы, народ». А ня «мы, дзяржаўныя мужы».

Сытуацыя сапраўды нагадвае дурную бясконцасьць. Галоўнае адрозьненьне гэтага мэтафізычнага панятку ад рэальнай бясконцасьці палягае на тым, што з заганнага кола бясконцых адлюстраваньняў аднаго й таго ж можна вырвацца. Для гэтага трэба паглядзець на сытуацыю іншымі вачыма, вольнымі ад стэрэатыпаў фэадальнага мысьленьня.



PHOTOBYMEDIA.NET

# Лянкевіч у Дрэздэне

У Нямеччыне адчыняецца пэрсанальная выстава фотакарэспандэнта «Нашай Нівы».

«Фокус на Беларусі» — такую назву будзе мець выстава Андрэя Лянкевіча, якая адчыніцца 14 жніўня ў Дрэздэне (Нямеччына). Здымкі фотажурналіста — вытрымкі зь беларускай штодзённасьці: «простыя» людзі ў вёсках, міліцыянты на вуліцах, незалежныя мастакі, моладзь, незадаволеная сучаснасьцю, і мінулае, якое ніяк ня хоча сысьці ў нябыт.

Арганізатар выставы — Свэн Стайнбэрг, кіраўнік дрэздэнскага аб’яднаньня «omtreuna

# Позірк у невядомую краіну

Часам вобразы эпохі, а часам — гогалеўскія гратэскі. Пра працы Андрэя Лянкевіча піша нямецкі журналіст **Інго Пэтц**.

Існуе ня так шмат фатографаў, якія могуць аб’ектыўна, без уплыву розных клішэ адлюстраваць сёньняшнюю Беларусь, ды яшчэ паказаць пры гэтым яе гістарычную і культурную раздробленасьць, палітычную пасіўнасьць і адначасовую прагу зьменаў, яе няўстойлівы аптымізм, бязьмежную весялосьць і крыклівую лёгкасьць. Фатографу Андрэю Лянкевічу ўсё гэта ўдаецца. Ён стварае хроніку схаваных зьменаў, якія пакідаюць старую Беларусь па-за сабой і адчыняюць новыя дзьверы.

У свае маладыя гады Лянкевіч валодае вялікім мастацкім талентам, які ўжо сёньня дазваляе назваць яго адным з найлепшых фатографаў краіны.

Лянкевіч мае востры кампазыцыйны позірк, ён умее бачыць і ствараць сцэны і выявы. Часьцяком падаецца, што ён нібыта рыхтуе невялічкія тэатральныя сцэны. Але вынік выходзіць ня столькі структураваным, колькі імправізаваным. Аўтар захоўвае паэзію натуральнага, валодае магіяй быць у патрэбны час у патрэбным месцы настолькі, што часам ажно захапляе дух.

Спалучэньне мастацтва і журналістыкі лучыць Лянкевіча з такімі вядомым фотарэпартэрамі, як Робэрт Капа або Генры Картэр Брэсан, якіх ён сам называе сваімі прыкладамі. Лянкевіч не прымае паставы палітычнага ці маральнага абвінаваўцы. Дакумэнтальнасьць — яго асноўны прынцып. Пры гэтым Лянкевіч стварае настолькі вялікую прастору для інтэрпрэтацыяў, што ў гледача застаецца права выбару. Гэта сьведчыць ня толькі пра дэмакратычнасьць фатографа, але і пра яго павагу да іншых людзей.

Фотаздымкі адлюстроўваюць нечаканыя моманты паўсядзённага жыцьця. Ён зьяўляецца адным з праціўнікаў інсцэніраваных фотаздымкаў. У аўтакратычнай Беларусі, якая вонкі прэзэнтуе сябе хутчэй як інсцэніроўка, фасад, работы Лянкевіча адкрываюць від на рэчы, якія ня так проста ўбачыць, робяць схаванае яўным, разбураюць фасад і паказваюць рэчаіснасьць: беларускае жыцьцё і яго дзіўныя кветкі.

Адзін са здымкаў зьяўляецца асабліва яскравым прыкладам мастацтва Лянкевіча. На ім мы бачым Кастрычніцкую плошчу ў Менску. Жанчына нясе савецкі сьцяг, і яго зьзяючы чырвоны колер зьяўляецца ледзьве не адзінай каляровай плямай на малочнашэрым фоне перад Палацам Рэспублікі. Жанчына трымае сьцяг у выпрастанай руцэ, быццам бярэ ўдзел у ваенным паходзе ці ідзе на чале параднай калёны. Але яна зусім адна на гэтай вялізнай плошчы перад манумэнтальным будынкам, захутаным у вэлюм туману, які бязьлітасна прарастае з фону і перабірае пальцамі па каменьнях плошчы, нібы па магільных плітах. Нам не вядома ні куды гэта жанчына ідзе, ні адкуль прыйшла, але дакладна ясна адно — яна мае свой ідэал, які абараняе. І робіць яна гэта ня проста з гонарам, а нават зь нейкай дзіцячай упартасьцю. Нават гэтая мёртвая цішыня, адзінота, падкрэсьленыя манумэнтальнай архітэктурай і туманам, ня могуць яе стрымаць.

Туман сымбалізуе пагрозу, небясьпеку, нешта невядомае, магчыма, — адсутнасьць арыенціраў, якую беларусы адчулі на сабе пасьля распаду СССР, і якая прымусіла іх ухапіцца за старыя ідэалы і за нэасавецкасьць прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі. Прычына гэтаму — боязь зьменаў. У гэтай жанчыне можна пабачыць вобраз сучаснай Беларусі, якая ізалявана, аднак самаўпэўнена крочыць у будучыню праз нежывую сучаснасьць. Але тут таксама схаваная іронія. Ёсьць пэўная камічнасьць у тым, наколькі мэтанакіравана і цьвёрда крочыць па бязьлюднай плошчы гэтая жанчына са сьцягам мінулых часоў у руках. Вялізарныя пазбаўленыя знакаў жыцьця будынкі, ахінутыя туманам, ствараюць атмасфэру дэфармаванай фантастычнай казачнасьці, якая быццам зьбіраецца нам паведаміць, што ў сьвеце, адлюстраваным на гэтым здымку, ня дзейнічаюць звычайныя зямныя правілы.

Наколькі шматузроўневая, наколькі шматзначная гэтая праца! Яе арыгінальнасьць заключаецца ў спалучэньні казачнага і фантастычнага, таямнічага, змрочнага, вясёлага, сьмешнага і мэлянхалічнага. Яна падкрэсьлівае ўпартую прагу да жыцьця, якую адчуваеш, прыехаўшы ў Беларусь, краіну часам падобную да Краіны цудаў, у якую трапіла Аліса.

Разам з фатографам мы наведваем вясельлі, таямнічыя кабінэты, мы ідзем на сустрэчу з працаўнікамі фабрыкі, на вясковае поле назіраць за пазбаўленымі фальшывай рамантыкі сялянамі. Не абыходзіцца і без смажаньня парасяці; той, хто ўжо ведае, што гэта такое, пацьвердзіць: сьвяты рытуал. І менавіта так Лянкевіч адлюстроўвае гэту працэдуру на фотаздымку, амаль як на іконе.

На іншым фотаздымку можна ўбачыць зухаватага маладога чалавека пад вялізарным нацыянальным гербам. Маладое пакаленьне, якое не дазваляе дыктаваць сабе правілы і якое нават пры моцным дзяржаўным кантролі ад-

— масты ва Ўсходнюю Эўропу», падкрэсьлівае: «Мы вельмі цешымся з магчымасьці прэзэнтаваць фотаздымкі Андрэя Лянкевіча ў Дрэздэне. Ён, несумненна, належыць да найбольш яскравых маладых талентаў сваёй краіны, якая, на жаль, успрымаецца ў Заходняй Эўропе кан'юнктурна і абмежавана — найперш у палітычным кантэксьце».

Мэта выставы — паказаць шматлікія вымярэньні рэальнасьці Беларусі, забытай краіны Эўропы. «Зь іншага боку, мы таксама хочам паказаць шырокай грамадзкасьці, які патэнцыял мае маладая Беларусь, найперш — на прыкладзе працаў Андрэя Лянкевіча, — кажа Свэн Стайнбэрг. — У любым выпадку, будучыня Беларусі адкрываецца ў новай пэрспэктыве, пра якую варта паразважаць глыбей». У адкрыцьці выставы, якая будзе суправаджацца шырокай культурніцкай праграмай, прыме ўдзел сам аўтар здымкаў. Працы Андрэя Лянкевіча, фотажурналіста, прэзэнтаваныя на выставе, будуць таксама выдадзеныя каталёгам (наклад 1300 асобнікаў).

**Алесь Кудрыцкі**



### «Фокус на Беларусі»

Выстава працуе: **14.08—06.09.2007**

Месца правядзеньня выставы: Kulturverein riesa efau, Adlergasse 14, 01067 Dresden http://www.riesa-efau.de

Расклад мерапрыемстваў:

**Чацьвер, 16.08. 17.00**

Адкрыцьцё выставы

**Пятніца 17.08. 10.30—20.30**

Дыскусія «Правы чалавека ў беларускай сучаснасьці»

**Панядзелак 27.08. 20.00**

Чытаньні «Фокус на Беларусі — маладая літаратура зь Беларусі і пра Беларусь»

Творы Надзеі Лажко, Артура Клінава, Інго Пэтца

**Чацьвер 30.08. 20.00**

«Фокус на Беларусі — 53! Вечарынка на дзень нараджэньня — для і без Аляксандра Лукашэнкі». Дыскатэка

**Панядзелак 03.09. 20.00**

Паказ дакумэнтальнага фільму «89 мм — жыцьцё ў апошняй дыктатуры Эўропы». Выступ рэжысэра Сэбасьцяна Хайнцэля

**Чацьвер 06.09. 19.30**

Закрыцьцё вэрнісажу

Канцэрт гуртоў «Solche» і «Expertus» (Нямеччына). Дыскатэка

ваявала сабе выспачку свабоды, таксама знаходзіць адлюстраваньне на фотаздымках. І гэта ня дзіўна: Лянкевіч сам да яго належыць.

Наступны прыпынак — дэманстрацыя, удзельнікі якой шчыльна прыціснуліся адзін да аднаго. Пакрытыя сьнегам, у бледна-аранжавым сьвятле ліхтароў, яны выглядаюць як несьмяротныя духі на карціне мастака-рамантыка.

Фатограф паказвае нам дзяцей, якія гуляюць з аўтаматам, дзяўчат, якія шумна сьвяткуюць заканчэньне школы.

У пакоі мы сустракаем салдата, які, упрыгожаны рагамі аленя, знаёміць нас са сваімі дзецьмі. Ідылія. Дакладней — амаль ідылія.

Мы перажываем каталіцкія мшы і паганскія сьвяты.

На наступнай працы — шампанскае, нарэзаная кілбаса на стале перад тэлевізарам, у якім прамаўляе Лукашэнка.

Потым перад намі паўстае Дзед Мароз, якога сярод глыбокага сьнегу цкуюць аўчаркамі два аўтаматчыкі. Ізноў камізм абсурду і фантастыкі, у які захутаныя фотаздымкі, якія сваім зьместам нагадвае гогалеўскія гратэскі. У гледача гэта можа выклікаць як пачуцьцё дыскамфорту, няёмкасьці, так і ўсьмешку. Не застаецца нічога іншага, як шукаць карані разбуранай ідыліі.

Такія здымкі могуць выйсьці толькі тады, калі фатограф вызваляе сябе ад страхаў, прынудаў, абмежаваньняў, калі ён застаецца назіральнікам, які здольны і хоча перакрочваць межы. Для гэтага патрэбныя стойкасьць, сьмеласьць і ўнутраная свабода. У Андрэя Лянкевіча ўсё гэта ёсьць. Ён належыць да новага пакаленьня беларусаў, чые творчыя здольнасьці зьяўляюцца доказам таго, што, насуперак усім перашкодам, гэтая краіна зьменіцца. Гэтае пакаленьне марыць пра іншую, вольную і адкрытую Беларусь. Гэтыя мары ўжо доўгі час знаходзяць адлюстраваньне на жывой культурнай сцэне: у літаратуры, у мастацтве, у песьнях. Там таксама можна сустрэць фантастычныя, казачныя элемэнты, якія або ўсхваляюць недасягальную краіну-мару альбо сьмяюцца з псэўдасавецкіх дэкарацый, пабудаваных Лукашэнкам. Бадай, справа вось у чым: не такая гэта простая задача як для турыстаў, так і для саміх беларусаў — спазнаць і ўбачыць сапраўдную Беларусь.

Лянкевіч бярэ з сабой гледача, калі ідзе з фотакамэрай на сваё памежжа, туды, дзе сустракаюцца старая і новая Беларусь, дзе разбураецца існуючая рэальнасьць і за былымі дэкарацыямі паўстае дзіўная і невядомая краіна. Як гарадзенец, Лянкевіч мае ідэальныя магчымасьці для таго, каб адкрываць гэтыя тонкія пераходы. З часоў заснаваньня Горадня зьмяніла шмат уладароў. Места вандравала паміж рознымі краінамі і культурамі, зьмянялася і самасьцьвярджалася. І ў сёньняшняй Беларусі гэты горад зьяўляцца выспай, населенай тымі, хто прагне зьменаў. Цяжка супрацьстаяць вятрам гісторыі, не згубіўшы пры гэтым галаву і, у выніку, самога сябе. Найлепш гэта ўдаецца тым, хто сам зьяўляецца востравам. Таму працы Лянкевіча маюць такое вялікае значэньне. Яны — востраў, абдзіманы ветрам волі.

# Лені Рыфэншталь беларускай літаратуры

Пісьменьнік на службе сталінізму. Пра Эдуарда Самуйлёнка піша **Сяргей Богдан.**

5 жніўня споўнілася сто год ад нараджэньня пісьменьніка, які стаў яркім увасабленьнем супярэчнасьцяў беларускага лёсу ў XX стагодзьдзі — Эдуарда Самуйлёнка. Паверыўшы ў «сьветлую» камуністычную будучыню, ён ня стаў шэраговым партыйным творцам, а, заплюшчваючы вочы на адмоўнае, сіліўся дапамагчы ў пабудове Ўтопіі. За трыццаць два пражытыя гады Эдуард Самуйлёнак напісаў нямала годных тэкстаў.

Рэжысэрка Лені Рыфэншталь з посьпехам аддала свой талент на службу гітлераўскаму рэжыму, Самуйлёнак — савецкаму. Юрка Віцьбіч пісаў, гэны Самуйлёнак — прыклад таго, «як савецкая рэчаіснасьць забівае таленты», маўляў «спадманулі русальчыны сьцежкі». Але ці ня варта адмовіцца ад гэтага ўмоўна-пажадальнага тону ў развагах, маўляў, вось калі б Самуйлёнак мог пісаць вольна? Чаму не зірнуць на яго такім, якім ён ёсьць — прыкладам існаваньня і досыць плённага разьвіцьця таленту ва ўмовах таталітарызму. У кожнай галіне, нават самай няўдзячнай, бываюць свае таленавітыя працаўнікі.

Сёньня чытаць Самуйлёнка цікава, і гэта той нешматлікі прыклад беларускай літаратуры БССР, калі я магу чытаць нешта без прымусу. Гэты чалавек верыў у тое, што пісаў, і ведаў, як пісаць. Таму ня так істотна, якія ідэалягічныя погляды ён адстойваў. Сапраўды, нават куды больш жахлівыя і крывавыя, чым камунізм, ідэі часам натхняюць людзей на незвычайнае геройства і самаахвярнасьць ці стварэньне геніяльных твораў. Згадайма будаўнікоў сусьветных імпэрыяў ці крывавыя дарогі рэлігійных вояроў альбо вялікія прапагандысцкія палотны Жака Люі Давіда. Вось і пецярбурскага хлопца-беларуса Эдуарда Самуйлёнка прыцягнула да сябе такая прыгожая карціна ўсясьветнае ўтопіі камуністычнае рэвалюцыі.



Цікава, што антыкамуніст Віцьбіч асьцерагаўся бэсьціць Самуйлёнка, зазначаючы, што той — «не «рабкор» і не «пісака», а адзін з найбольшых беларускіх (па форме) і савецкіх (па накінутым яму жыцьцём зьместу) пісьменьнікаў». Віцьбіч кажа пра іншы, «сапраўдны твар Самуйлёнка, забітага ў літаральным і ўскосным сэнсе бальшавікамі». Але тут ужо Віцьбіч зашмат бярэ на сябе і занадта аддаляецца ў сфэру мітычнага і ўяўнага. Зірнем на тое, што засталося па гэтым творцы, не гадаючы пра тое, што не збылося.

Засталіся ж сапраўды чытэльныя дый вартыя ўвагі шматлікія апавяданьні, аповесьць «Тэорыя Каленбрун», грузінскі раман «Будучыня», п’есы «Сяржант Дроб» ды «Пагібель воўка». Важна, што гэтыя творы не пахаваныя намёртва ў вясковай рэальнасьці, як многія творы беларускай літаратуры мінулага стагодзьдзя. Гэта — адна зь першых спробаў вывесьці мадэрную беларускую літаратуру за гермэтычныя вяскова-засьцянковыя рамкі, чытанка, прыдатная да гараджанаў і даступная іншым пакаленьням.

Самуйлёнак разумеў, што беларуская літаратура ня мусіць абмяжоўвацца роднай вёскай дый сьмела рушыў у Грузію, каб напісаць сэрыю твораў пра каўкаскую краіну. Ён ня быў кабінэтным творцам, як некаторыя нават сёньняшнія аматары напісаць пра нябачаныя імі джунглі ды людажэраў. Гэты чалавек спачатку, як Грэм Грын, на сваёй скуры адчуў пралетарскі стан, пілуючы дошкі, дый сьпёкся пад сонцам Калхіды. Ня дзіва, што й пісаў ён пра пралетарыят ды далёкія краіны так, што гэта чытаецца і праз дзесяцігодзьдзі.

*Маладэчна*

## СЬЦІСЛА

### Помнік у Лынтупах

5 жніўня ў Лынтупах (Пастаўшчына) адкрылі помнік Баляславу Ялавецкаму, інжынэру-чыгуначніку, прадпрымальніку (XIX ст.) Скульптар Алесь Шатэрнік бескаштоўна вырабіў бюст, устанавіць дапамог райвыканкам.

### Памёр пісьменьнік з Марсу

Ня стала Хведара Жычкі. Нарадзіўся ён у 1927 у пасёлку Марс Жлобінскага раёну. Быў рэдактарам «ЛіМу». Яго дзіцячыя кнігі пра вайну чытаюцца.

**МБ**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Юбілей Скалабана**

**Гісторык Віталь Скалабан 5 жніўня адсьвяткаваў 60-годзьдзе. Адзін з найлепшых знаўцаў гісторыі Беларусі XX ст. нарадзіўся ў вёсцы Шылавічы Слонімскага раёну. Працу пачаў у выдавецтве «Беларуская энцыкляпэдыя». Схаваўшыся ў Нацыянальным архіве ад зьменлівасьцяў часу, гісторык Скалабан капае і капае мінуўшчыну беларускай культуры. Доўнар-Запольскі, Улашчык, Купала, Гарэцкі, КПБ — толькі асобныя аб’екты яго зацікаўленасьці. Рэдакцыя «НН» далучаецца да віншаваньняў.**




## Сьцяг вышэй!

**Пабачыў, як выглядае ўлётка, за распаўсюд якой было затрымана каля 60 юнакоў і дзяўчат** («НН», №27), і сэрца не стрывала. Няўжо ніхто ня дасьць па руках гэтым «малярам», у якіх на сьвяточных плякатах нехта топчацца па нацыянальнай сьвятыні? Дый наагул, сьцяг унізе (апроч схіленага ці прыспушчанага ў памяць загінуўшых патрыётаў) выглядае звышненатуральным. Існуе нават устойлівае словазлучэньне «узьняць сьцяг» альбо у дадзеным выпадку «ўзьняць сьцяг у гонар…»

Я памятаю, як 1 траўня 2002-га чорныя людзі валаклі мяне па плошчы перад магілёўскім аблвыканкамам, а за сьпінай пачуў, як на пытаньне: «За што яго?» — чысты дзявочы голас адказвае: «За тое, што падняў наш сьцяг!» Памятаю, як за гэты сьцяг потым душылі мяне, вырваўшы гузік, у заглушаным мікрааўтобусе з танаваным шклом, выцягнулі з дыктафону стужку з рэпартажам, забралі пачатак цыгарэтаў, шкуматалі палотнішча. Па сканчэньні дзяржаўнага сьвята мяне выпусьцілі (ужо з пастарунку), рэчы не вярнуўшы. Толькі сьцяг падпалкоўнік прынёс, хаця і ладна пакамечаны, але акуратны згорнуты… (Нічога, сьцяг важнейшы, а ўжо тронкі да яго хутка знайшліся й новыя.) Дык атрымліваецца, што нашыя ворагі болей паважаюць наш сьцяг?

**Юрась Шпак-Рыжкаў, Менск**

## Горка за Мілінкевіча

**Паважаная рэдакцыя, прайшло колькі часу, а я не магу супакоіцца,** думаючы пра паводзіны нашых апазыцыйных функцыянэраў адносна сп. Мілінкевіча. Так яму дапамагаць набыць вядомасьць, але потым выкінуць — мякка кажучы, не паджэнтэльмэнску. Тым больш, калі прывесьці простае апытаньне, большасьць людзей ня ведае ні сп.Вячорку, ні Калякіна, ні тым больш іншых. Дарэчы, на Аршанскім фэсьце на Крапівенскім полі апроч Мілінкевіча і недзе ў 95—96 г. Пазьняка зь вядомых людзей я бачу амаль штогод сп.Арлова і Пушкіна. Пра дапамогу ў правядзеньні сьвята з боку партый размовы не ідзе…

**Генадзь Шэпелеў, Ворша**

## Арлоў — «нізьзя»

**Літаратарам на чале з Чаргінцом дарога на Случчыну адчыненая.** Нядаўна тут пабывалі вядомыя крытык і паэт. Для іх адвялі залю ў цэнтральнай гарадзкой бібліятэцы. Дырэктарам школаў далі каманду забясьпечыць адпраўку на сустрэчу старшакляснікаў.

А вось Уладзімеру Арлову і Вользе Іпатавай давялося ў Слуцку сустракацца з чытачамі на кватэры. Сабраліся дэмакраты, пэнсіянэры. І ніводнага настаўніка ці школьніка. Бо сустрэчы арганізоўваліся ўпотай.

Спробы ўлагодзіць улады былі. Неяк старшыня Слуцкай суполкі ТБМ Мікалай Курыльчык зьвярнуўся зь пісьмовай заявай да начальніка аддзелу адукацыі райвыканкаму Дзермана, у якой выказваў просьбу дазволіць Іпатавай сустрэчу з чытачамі ў найстарэйшай гарадзкой гімназіі (заснаваная ў 1617 г.). І атрымаў адказ, што праграма культурна-асьветніцкіх мерапрыемстваў складзена на ўвесь год, у сувязі з чым правядзеньне прапанаванага мерапрыемства не падаецца неабходным. «Нізьзя!» — як калісьці гаварыў Аркадзь Райкін.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

## Царква павінна ўдзельнічаць у палітыцы

**Кожны год я наведваю хрысьціянскія канфэрэнцыі ў Рызе.** Што мяне ўразіла сёлета — гэта тое, што латвійская царква займае пазыцыю перад выбарамі прэзыдэнта, якія адбыліся нядаўна. Пастар А.Лядзяеў з царкоўнай катэдры патлумачыў сваім прыхаджанам, на кім воля Божая, і заклікаў маліцца за кандыдата, які бліжэйшы да пазыцыі царквы. Потым выступіла дэпутатка Сойму Фэльдманэ, якая зьяўляецца прыхаджанкай іх царквы. І дасьціпна дала зразумець, чаму яна, як хрысьціянка, аддасьць свой голас за кандыдата Затлерса. «Я ўбачыла, што сп.Затлерс адказваў на пытаньні шчыра, пераканаўча. І таму я ўбачыла ў гэтым чалавеку патрыёта Латвіі. Канечне, мы павінныя маліцца, таму што палітычная машына жорсткая. Трэба, каб гэты чалавек устаяў у той маральнай і духоўнай пазыцыі, якую ён цяпер мае».

Вось так разважаюць вернікі ў Латвіі. Гэта прыклад, як павінныя сьвятары вучыць адрозьніваць дабро і зло ў палітыцы.

А ўяўляеце: перад нашымі мінулымі выбарамі выходзіць сьвятар і з царкоўнай катэдры абвяшчае, чаму мы павінныя маліцца за сумленнага і прыстойнага кандыдата А.Мілінкевіча. І чаму з біблійнага пункту гледжаньня нельга аддаваць свой голас за ўсім вядомага кандыдата, каб не гнявіць Бога. Ды гэта цяжка ўявіць!

Але час свабоды прыйдзе ў нашую краіну, і прыход гэтага часу нішто ня спыніць.

**Хрысьціянка Ірына Гоманава, Менск**

## У шортах не паложана

**Ці ведае хто-небудзь, зь якой нагоды ў райвыканкамах разьмясьціліся міліцэйскія пасты?** Барацьба з тэрарызмам, ці нейкая пагроза жыцьцю нашых чыноўнікаў і дэпутатаў мясцовага ўзроўню? Ня ведаю. Але ў нашым Лунінцы такі вартавы парадку ў званьні старшыны нясе службу спраўна. І зброю мае пры сабе, гумовую палку.

Цікавы выпадак здарыўся з маім знаёмым на мінулым тыдні. Трэба было яму да аднаго з чыноўнікаў, вось і вырашыў наведаць райвыканкам. Сьпякота, лета ж на дварэ: адпаведна апрануты — летняя кашуля і шорты. Паехаў зь вёскі на аўтобусе ў райцэнтар.

Прыйшоў у райвыканкам — і з пытаньнем да міліцыянта:

— У якім кабінэце знаходзіцца такі і такі чыноўнік, на якім паверсе?

— Табе сюды не паложана! — пачуў замест адказу на сваё пытаньне .

— Прабачце, я не зразумеў .

— Што непанятна, у шортах не паложана!

— А хто забараняе? Чаму вунь у вас дзяўчаты ходзяць у міні, ажно трусікі відаць ?

— Я сказаў, што не паложана.

Мой прыяцель ня стаў спрачацца, пайшоў у краму, набыў там нагавіцы.

Але марнымі аказаліся яго намаганьні. У нагавіцах яго прапусьцілі, але патрэбнага чыноўніка ўжо не было на месцы.

І сьмех і грэх.Чаму дыскрымінуюць шорты — такая зручная і камфортная для лета вопратка?

**МІ, Лунінеччына**

## ВОДГУК

## Варта выбачыцца перад Браніцкай

**Варта было Рэдакцыі «НН» выбачыцца перад Э.Браніцкай («НН», №28).**

Пазыцыя А.Класкоўскага ясная: стары журналіст, піша пра ўвогуле; каб агледзець усю зямлю, уздымаецца высака, ну дзе яму ўбачыць пакрыўджаную душу. Няўжо ніхто ў «НН» ня здолеў прымерыць на сябе пакуты Эніры і яе сяброў у скляпеньнях таго жоўтага дому? Іначай «НН» ставіць у адзін шэраг і змагароў за права людзьмі звацца і тых, хто іх па скляпеньнях цягае.

**У.Рысевец**

**Ад Рэдакцыі.** Паважаем Ваша меркаваньне і думку Э.Браніцкай — досыць сказаць, гэта была ідэя Рэдакцыі зьвярнуцца да яе па камэнтар — аднак застаемся ў перакананьні, што трэба інфармаваць і пра С.Сухарэнку.

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

**Наш адрас: а/с 537, 220050 Менск.**
**e-mail: nn@nn.by.**
**Факс: (017) 284-73-29**

# Грузія безь дзьвюхкосьсяў

Піша Сяргей Харэўскі.

Праз пару гадзінаў лёту пад крыламі самалёта зьяўляюцца бялюткія сьнежныя гурбы й зіхоткія льды Вялікага Каўказу. Ніжэй гораў толькі хмары. Вышэй гораў толькі сонца. Як у запаволенай кінастужцы праплывае Эльбрус, аблёт якога займае чвэрць гадзіны.

За гарамі панарама Грузіі адкрываецца зьнянацку, варта самалёту падныркнуць пад аблокі. Зьверху гэты край нагадвае школьныя макеты рэльефаў у клясе геаграфіі — горы, цясьніны, стэпы, балоты, рэкі, тысячы вёсак, вялікія гарады, вінаграднікі і лясы — уся разнастайнасьць ляндшафтаў Зямлі, як у лялечнай мініятуры. Ці ў кампутарнай гульні...

## Тут быў Купала

Для тых, хто заканчваў савецкую школу, Грузія ня terra incognita. Хто ня ведаў імя Шата Руставелі, нават не чытаўшы ягонае слыннае паэмы пра віцязя? Пушкін, Лермантаў, Грыбаедаў, Талсты, Чэхаў, Горкі, Маякоўскі стварылі запамінальныя, яркія грузінскія вобразы, што непарыўна зьнітавала гэты край з расейскай клясыкай.




І грузіны ім шчыра аддзячылі. Вялікія помнікі, бюсты й незьлічоныя мэмарыяльныя табліцы расейскім клясыкам, якія гэтак палюбілі Грузію, засталіся тут паўсюдна.

Малым у школе я трызьніў тымі вобразамі Грузіі, шматкроць малюючы гісторыю Мцыры. А пасьля мне патрапілі ў рукі пераклады Лермантава на беларускую. А пасьля — кніжка Янкі Лучыны, які ў 1870-я працаваў у Грузіі, зь вершам «Велічны малюнак»…А пасьля — хрэстаматыйныя вершы пра Грузію Купалы. А яшчэ грузінскія матывы ў Броўкі і Панчанкі, запылены том рамана пра Грузію Самуйлёнка «Будучыня» ў школьнай бібліятэцы і зборнік грузінскіх апавяданьняў «Твае грузінскія сябры», кшталтавалі ўласную беларускую сьвядомасьць. Таму для нас гэты край не чужы.

## Усё па-грузінску

Па старой памяці, бываўшы ў Грузіі колькі разоў за савецкім часам, я меў цэласнае й дыялектычнае ўяўленьне пра тамтэйшы люд і лад. Але старыя ўяўленьні адразу разваліліся, калі ў ілюмінатары ўбачыў на бэтоне суседняе пасадачнае паласы вялізарны вайсковы транспартны самалёт U.S. ARMY, а над шыкоўным навюткім аэрапортам — сьцягі Эўразьвязу й Турцыі.

Грузія шукае саюзьнікаў і знаходзіць. Амэрыканцы цяпер маюць тут вайсковае прадстаўніцтва, ахоўваюць сваю маёмасьць, трэніруюць грузінскіх вайскоўцаў і ладзяць рэгулярна супольныя манэўры. Эўразьвяз ладзіць шматлікія гуманітарныя праекты, разгортвае шматлікія праекты ў гандлі й энэргетыцы. А туркі ўкладаюць рэальныя грошы й шмат будуюць.

Той, хто думае, што менскі чыгуначны вакзал самы вялікі, — наіўны. Тбіліскі яшчэ большы! Страшэнная бэтонная спаруда 1970-х гадоў засьціць нават горы. Што праўда, руйнаваць старасьвецкі чыгуначны вакзал грузінам не прыйшло ў галаву. Цяпер яго рэстаўраваны хварсісты фасад выгодна вылучаецца з хаосу прывакзальных пабудоў, што сваім пыльным выглядам шчымліва нагадваюць савецкае мінулае….

У Грузіі цяпер усё па-свойму, насамрэч па-грузінску. У тым сэнсе, што, маючы старажытны альфабэт, яны ня рупяцца пра пераклады шыльдаў і аб'яваў на іншыя мовы. Гэта змушае ўступаць у несупынныя вэрбальныя кантакты з тутэйшымі людзьмі. І адразу ж станавіцца часткаю іхнага вірлівага й іскрыстага жыцьця. «30 маленькіх», — кажа сівы й смуглы дзядзька ў камэры захоўваньня. «А як у вас называюцца



цяпер гэтыя капейкі?» «Маленькія? Якая розьніца, як яны называюцца? Як кажа Хачыкян, сам убачыш…»,— вясёла адказаў дзядзька, захавальнік багажу. Яго шматслойны гумар так і пакінуў мяне ва ўсьмешлівай разгубленасьці. Хто такі Хачыкян? Дзе ён так кажа? Як называць тутэйшыя грошы? Зрэшты, і насамрэч, якая розьніца?

## Тры Вільні

Тбілісі можа шакаваць непадрыхтаванага госьця. Вялізарны стары горад, што не зазнаў бамбардзіровак і ня бачыў лютых войнаў XIX і XX стагодзьдзяў, стаіць збольшага такім самым, што й за часоў Тадэвуша Лады-Заблоцкага і Франца Савіча, якіх зь Беларусі саслалі сюды расейскія ўлады. Старасьвеччыны тут болей, чым у Вільні. Але й выгляд гэты чароўны старажытны горад мае самы старажытны, сапраўдны. Без газаправодаў, цэнтральнага водаправоду, ацяпленьня. Не было іх тут за савецкім часам, так што мала што згубілі. Але зьберагглі непаўторны, праўдзівы дух старасьвеччыны: шыкоўныя аздобы аптэкаў і крамаў, безьліч антыкварных рэчаў у самых простых і празаічных месцах, водар

Працяг на старонцы 24.

зьбяры «Кнігарню «Наша Ніва»




**Найясьнейшая Рэч Паспалітая:** Цывілізацыя—Культура—Рэлігія—Палітыка—Авантура—Героіка—Успамін.




**Наталка Бабіна. Крыві не павідна быць відна.**




**Паветраны шар**: беларускае мужчынскае апавяданьне.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка **3012 206 280 014** Асабовы рахунак

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

КВІТАНЦЫЯ

Касір М.П.

# Каб штотыдзень атрымліваць газэту,

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 8 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз:** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32 (МТС), (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: а/с 537, 220050 Менск.

2) **Просім у блянку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перақазу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

Па пытаньнях атрыманьня газэты пытайцеся Рамана.

# Беларусь у эўрапейскай салянцы

Ці прынясе беларускай культуры карысьць сяброўства нашай краіны ў Эўрасаюзе? Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Эўрапейскі выбар Беларусі. Наўрад ці будзе памылкай сказаць, што гэтыя тры словы гучаць як аксіёма для большасьці (хоць і не для усіх) прыхільнікаў перамен. Але што канкрэтна хавае ў сабе эўрапейская пэрспэктыва, ахутаная смугой рамантычнага аптымізму?

Эўропа — гэта свайго кшталту ідэя, а Эўрасаюз — гэта пэўная палітычная сыстэма, якая функцыянуе паводле адмысловых законаў. Зрэшты, можна заставацца стоадсоткавымі эўрапейцамі, як швайцарцы ды нарвэгі, не прымаючы эўрасаюзных правілаў гульні. Беларусь, як ні круці, была ёсьць і будзе часткай гэтай эўрапейскай ідэі. А вось ці зробіцца яна часткай Эўрасаюзу — яшчэ не вядома. Ці трэба мы Эўрасаюзу — справа другая. Галоўнае пытаньне — ці патрэбны ён нам.

Для таго, каб збольшага прааналізаваць усе плюсы ды мінусы далучэньня Беларусі да Эўразьвязу, газэты ня хопіць. Пра палітычныя ды эканамічныя выгоды прыяднаньня да ЭС кажуць больш-менш часта. Але што можа прынесьці сяброўства ў ЭС беларускай культуры?

## Як функцыянуе Эўрасаюз

Спачатку паспрабуем зразумець, як ствараецца эўрапейская палітыка. Журналісты часта бамбардуюць неабазнаных чытачоў складанымі схемамі, якія мусяць патлумачыць сыстэму прыняцьця ды ўзгадненьня рашэньняў у лябірынце эўрапейскіх структураў. Сэнсу ад гэтага, аднак, не дадаецца — бо не ствараецца агульнай карціны.

Натуральна, любое параўнаньне кульгае. Разам з тым, Эўрасаюз можна уявіць сабе як статак кароў, які гоняць два тузіны пастухоў — і кожны намагаецца скіраваць худобу ў свой бок. Адзін пугай шчоўкае, іншы на жалейцы грае. А тут яшчэ навокал дзеці гойсаюць, кабеты гукаюць, старыя на ўслонах вохкаюць, сабакі брэшуць, ды яшчэ дзівакаваты брыгадзір на ржавым ровары едзе ды ў званочак дзінькае. Каровы тупаюць сабе наперад, аднак, у залежнасьці ад таго, хто ім найбольш назаляе, пакрысе мяняюць кірунак. Нават муха, калі яна дужа актыўная, можа крышку паўплываць на траекторыю руху статку.

Статак кароў — гэта палітычныя структуры Эўрасаюз. Пастухі — гэта нацыянальныя ўрады ды іншыя дзяржаўныя інстытуцыі асобных краінаў, чальцоў ЭС. Астатнія раздражняльнікі — гэта мэдыі ды лабісты (акрамя хіба што калгасьніка на ровары, які тут сымбалізуе адмысловы геапалітычны фактар па-за межамі ЭС).

## Лабісты

ЭС — гэта барацьба інтарэсаў. Краіны, непасрэдна прадстаўленыя ў ЭС, актыўна цягнуць коўдру на сябе. З мэдыямі таксама усё збольшага зразумела — яны адлюстроўваюць (ці ствараюць) грамадзкую думку, да якой ЭС мусіць прыслухоўвацца. А вось пра лабістаў кажуць зусім рэдка ды цьмяна, хоць, насамрэч, яны ўплываюць на палітыку ЭС ня менш актыўна, чым нацыянальныя ўрады.

Лабіст — гэта той, хто не прадстаўлены ў структурах ЭС непасрэдна, але спрабуе ўзьдзейнічаць на іх рашэньні. Кожны робіць гэта па-свойму. Бізнэс працуе на шырокую нагу. Тытунёвыя кампаніі маюць у Брусэлі вялізныя офісы, якія намагаюцца зрабіць так, каб ЭС ня надта ціснуў на вытворцаў цыгарэтаў.

Недзяржаўны сэктар таксама прабівае свае інтарэсы — хіба што зь меншым шыкам. Ёсьць лабісты-акулы, накшталт «Грынпіс», хапае і дробнай рыбкі — маленькіх арганізацыяў, якія, тым ня менш, таксама імкнуцца прасоўваць свае задумы і ідэі. Аб'яднаньні нацменшасьцяў, рэлігійныя арганізацыі і г.д. дадаюць да палітры лабістаў свае фарбы.

Лабісты маюць магчымасьць атрымліваць адмысловыя «бэджыкі» для ўваходу ў Эўрапарлямэнт, сустракаюцца з палітыкамі, пераконваюць іх, прасоўваюць патрэбныя ім матэрыялы ў мэдыях, ладзяць публічныя акцыі. Надоечы давялося назіраць, як вытворцы прадуктаў з соі ладзілі ля сталоўкі Эўрапарлямэнту раздачу бясплатных соевых пудынгаў. Пакаштуе дэпутат такі пудынг ды падумае: «А што, нічога!» І, можа, прагаласуе некалі за датацыі для вытворцаў соі.

Найбольш распаўсюджаны від стварэньня лобі — асабістыя сустрэчы ды кантакты. Выпадковая сустрэча ў калідоры падчас перапынку парлямэнцкага паседжаньня. Бізнэс-ланч з чыноўнікам з Эўракамісіі. Віншавальныя паштоўка на каляды для знаёмага дэпутата. Каробка цукерак для сакратаркі ў патрэбным кабінэце. Добрае лобі дае вынік не адразу, складаецца зь сеткі прыватных кантактаў ды безьлічы вялікіх ды малых мэтанакіраваных акцыяў. Калі пашанцуе, у гэтым нераце заблытаецца дастаткова эўрапалітыкаў, каб прасунуць патрэбнае рашэньне. Статак эўрапейскіх кароваў ніколі ня дасьць вам малака за проста так. Іх трэба скіроўваць на патрэбны шлях, пасьвіць, даглядаць, і — у зручны момант — даіць.

## ЭС у пошуках сябе

Паўстагодзьдзя Эўрасаюз займаўся амаль выключна палітычнай ды эканамічнай інтэграцыяй. Культура адсоўвалася на другі плян. У апошнія гады, аднак, пытаньне культурніцкай палітыкі ў ЭС уздымаецца ўсё часьцей. Краіны перадалі ЭС значную частку свайго палітычнага ды эканамічнага сувэрэнітэту. Эўрасаюз, аднак, апошнім часам усё мацней хоча атрымаць і пэўныя культурніцкія паўнамоцтвы. Але краіны ня хочуць адмаўляцца ад культурнага сувэрэнітэту на карысьць аб'яднанай Эўропы.

Апошні час ЭС сутыкнуўся з праблемай, да болі знаёмай беларусам — неразьвітай самасьвядомасьцю. Што гэта значыць — быць эўрапейцам? Ці варта імкнуцца да таго, каб у будучыні жыхары ЭС лічылі сябе найперш эўрапейцамі, а ўжо потым — швэдамі, немцамі ці славакамі? Якой мусіць быць агульнаэўрапейская культура, і ці трэба яе ўвогуле ствараць?

Пакуль што ў ЭС моцныя ўплывы эўрапрагматыкаў накшталт Ангельшчыны, для якой ЭС — найперш эканамічная прастора, ня больш за тое. Новыя чальцы ЭС, найперш цэнтральнаэўрапейскія краіны, таксама не жадаюць, каб іх нацыянальныя культуры распусьціліся ў недагатаванай эўрапейскай салянцы. Францыя, хоць збольшага і выступае за разьвіцьцё нейкай супольнай эўрапейскай культуры, але відавочна жадае, каб тая мела выразны французскі пранонс. Таму краінам-эўрарамантыкам накшталт Нямеччыны давялося пакуль што зацугляць сваю фантазію і абмежаваць мары пра супольную Эўропу пытаньнямі палітыкі ды гаспадаркі. У культурніцкім пля-




**Беларуска-літоўская вёска Гервяты чакае свайго Архана Памука, які б уславіў яе на ўвесь сьвет.**

Калі Беларусь выйдзе на эўрасаюзную сцэну ды заявіць, што прыярытэт краіны — разьвіцьцё толькі беларускай культуры, то яе не зразумеюць.

Нельга спадзявацца атрымліваць нешта ад Эўропы, плюючы пры гэтым на яе прынцыпы.

не аб'яднаная Эўропа застаецца чыстай абстракцыяй.

У нетрах эўрапейскіх структураў, аднак, высьпяваюць грандыёзныя пляны. Сёлета ў траўні Эўракамісія зацьвердзіла культурніцкую стратэгію ЭС на бліжэйшую будучыню. У стратэгіі ўпершыню афіцыйна заяўлена пра патрэбу разьвіваць эўрапейскую ідэнтычнасьць — каб не згубіцца ў глябалізаваным сьвеце. Стратэгія прызнае, што культура эўрапейскіх народаў мае супольныя карані, а асэрца «эўрапейскага культурніцкага праекту» — павага да розных культураў ды моваў. Агульнаэўрапейская культура мусіць зрабіцца падмуркам будучай заможнай палітыкі Эўразьвязу.

Як будзе выглядаць гэтая культура? «Адзінства ў разнастайнасьці» — такі дэвіз новай культурніцкай стратэгіі, прапанаванай Эўракамісіяй. Як кажа Прэзыдэнт Эўрапейскай камісіі Жазэ Мануэль Барозу, «Эўропе трэба надаць душу».

## Культура як рухавік гаспадаркі

Новая культурніцкая стратэгія — не загад, а рэкамэндацыя нацыянальным урадам. Ці будуць яе трымацца краінычальцы, невядома. ЭС увогуле ня мае права выпрацоўваць культурную палітыку — гэта прыярытэт асобных краінаў, а ў некаторых выпадках, як у Гішпаніі ды Нямеччыне — асобных рэгіёнаў.

Такім чынам, новая культурніцкая стратэгія ЭС — гэта толькі спроба заахвоціць нацыянальныя ўрады ствараць культуру разам. ЭС сьцьвярджае, што супольная культура — гэта ня толькі файна, але і выгадна. Паводле статыстыкі, у сфэры культуры ў ЭС працуюць больш за 5 мільёнаў чалавек — недзе 3% ад усяго насельніцтва 25 краінаў. Доля культурніцкага сэктару ў эўрапейскім валавым унутраным прадукце склала 2,6% у 2003 г., пры гэтым эфэктыўнасьць сфэры культуры расьце нашмат большымі тэмпамі, чым эўрапейская гаспадарка ў цэлым. Фактычна, ЭС пачынае трактаваць культуру як індустрыю, бачыць у ёй магчымасьць па-новаму вырашаць эканамічныя праблемы. Разьвіваючы культуру, мы ствараем новыя працоўныя месцы, даем штуршок турызму, адсталыя рэгіёны робяцца больш цікавымі. Культура спрыяе бізнэсу — і сама робіцца бізнэсам.

## Дзе грошы ляжаць

Але што канкрэтна робіць ЭС для падтрымкі культуры, акрамя стварэньня стратэгіяў? Насамрэч, ня так ужо і шмат. Нядаўна Эўрапейскі форум мастацтва ды спадчыны, буйная культурніцкая лабісцкая арганізацыя са штаб-кватэрай ў Брусэлі, ладзіла акцыю «70 цэнтаў на культуру». Цяпер у Эўрасаюзе на культуру выдаткоўваюцца толькі сьмеху вартыя 7 цэнтаў на год у разьліку на кожнага жыхара ЭС. Акцыя, якая заклікала павялічыць падтрымку культуры ў дзесяць разоў, асаблівага плёну пакуль што не прынесла — фінансаваньне культурніцкіх праграмаў у ЭС застаецца на мінімальным узроўні.

Важны інструмэнт, з дапамогай якога ЭС дае падтрымку культурніцкім праектам у розных краінах, — праграма «Культура». Праграма мае, па эўрапейскіх мерках, зусім невялікі бюджэт: 400 мільёнаў эўра на 2007—2013 г. Гэта значыць, што на ўсе культурніцкія праекты ўва ўсіх 25 краінах-чальцах, а таксама ў краінах-кандыдатках ды на Балканах будзе выдавацца толькі па 50 мільёнаў эўра штогод. Дзеля параўнаньня — на ўтрыманьне аднаго Люўру Францыя выдаткоўвае амаль у чатыры разы болей (185 млн. эўра на год).

Больш сур'ёзныя грошы на культурніцкія праекты можна знайсьці праз структурныя фонды Эўрасаюзу. Гэта фінансавая дапамога на разьвіцьцё «праблемных» рэгіёнаў, спроба падцягнуць іх да агульнаэўрапейскага ўзроўню. Тут ужо ад самога рэгіёну залежыць, што ён зробіць з тымі грашыма — пракладзе новыя дарогі ці пабудуе опэрны тэатар. Так ці інакш, праз структурныя фонды праходзяць тры чвэрткі ўсіх эўрапейскіх сродкаў, якія ў выніку выдаткоўваюцца на культурніцкія мэты.

## «Дажынкі» па-эўрапейску

Калі праз структурныя фонды можна аднаўляць старажытныя палацы ды будаваць музэі, дык грошы з праграмы «Культура» ідуць на рэчы збольшага нематэрыяльныя. Найперш — на сустрэчы мастакоў, фэстывалі, дасьледваньні. Функцыянуе гэта падобна да конкурсу: калі ў нейкай культурніцкай арганізацыі зьяўляецца арыгінальная ідэя, яна шукае партнэраў для яе ажыцьцяўленьня, піша плян, ды падае яго на разгляд кіраўніцтву праграмы. А тое ўжо выбірае з пададзеных заявак самыя цікавыя.

Вось некалькі прыкладаў праектаў «Культуры», цікавых для Беларусі. З дапамогай праграмы быў праведзены тэатральны фэстываль «Акт-Ін» — на ім паказвалі п'есы сучасных драматургаў, якія пішуць на маларапаўсюджаных мовах, такіх, як каталёнская, эстонская ці ісьляндзкая. П'есы былі перакладзеныя ды адаптаваныя для нямецка- ды франкамоўнай публікі. Беларускі спэктакль быў

бы тут вельмі дарэчы.

Ці возьмем эстонскі студэнцкі горад Тарту. Улетку, калі студэнты зьяжджаюць, горад літаральна вымірае. З дапамогай праграмы «Культура» летняе сьвята гораду ператварылася ў буйны міжнародны фэст. У Тарту пацягнуліся турысты, бізнэс ачуняў. Чым не варыянт для аднаго зь беларускіх мястэчкаў?

Праграма «Культура» дапамагае захоўваць традыцыі драўлянага дойлідзтва ў Балтыцы ды Скандынавіі, а таксама ствараць эўрапейскі электронны архіў запісаў народнай музыкі. Дарэчы, праграма «Культура» дапамагала нават фінансаваць сьвяткаваньне 300-годзьдзя Пецярбургу, нягледзячы на тое, што Расея ня член Эўрасаюзу.

Мы пасьмейваемся з «Дажынак», хоць эўрапейцы таксама практыкуюць падобны падыход, а менавіта — штогадовыя выбары «эўрапейскай культурнай сталіцы». Цягам году ў культурнай сталіцы праводзяцца кінафэстывалі, тэатральныя марафоны, выставы, сымпозіюмы ды г. д. Паралельна па ўсёй Эўропе вядзецца адмысловая рэклямная кампанія гораду з мэтай прыцягнуць туды турыстаў. Адзін раз пабыўшы культурнай сталіцай, места робіцца вядомым, завязвае новыя культурніцкія кантакты, рэанімуе сваю турыстычную індустрыю — рэальна атрымлівае новы штуршок да жыцьця.

### Гандлёвы знак «Беларусь»

Ляўрэата Нобэлеўскай прэміі па літаратуры Архана Памука неймаверна раздражняе пашыранае ў яго роднай Турэччыне ўяўленьне, што «ад Захаду можна ўзяць вынаходніцтвы, мэтады ці рэчы, не аддаўшы за іх духоўнай платы». Беларуская дзяржава мае тую ж праблему.

Нельга атрымаць нешта ад Эўропы, плюючы на яе асноўныя прынцыпы. Пакуль урад сам ня будзе шчыра зацікаўлены ў тым, каб Эўрасаюз дапамагаў краіне разьвівацца ў культурніцкім пляне, спадзявацца на дапамогу ад ЭС не даводзіцца. І ўсё кардынальна зьменіцца, калі будзе воля дзяржавы на рух у Эўропу, тым больш — на ўступленьне ў ЭС.

Пакуль тое, трэба, паводле магчымасьці, ствараць грунт для будучага супрацоўніцтва, лабіраваць нашую культуру ў Эўропе праз нефармальныя каналы, прэзэнтаваць там нашых творцаў. Справа ў тым, што беларуская культура дагэтуль ня мае свайго выразнага «гандлёвага знаку» за мяжой, у адрозьненьне, скажам, ад францускай ці ад польскай культуры. Яго яшчэ давядзецца ствараць. Хаця мы не адны маем такую праблему — Славенія ці Славакія для эўрапейцаў такія самыя белыя плямы, як і Беларусь.

### Падрыхтоўка да сяброўства

Каб пачаць атрымліваць дапамогу на культуру ад ЭС, не абавязкова ўваходзіць у ягоны склад. Для пачатку хопіць шчырага жаданьня краіны для супрацоўніцтва. А статус кандыдата на ўступленьне ў ЭС ужо дазваляе ўдзельнічаць у эўрасаюзных культурніцкіх праграмах на роўных. Было б цудоўна, каб хаця адзін беларускі горад хоць некалі зрабіўся эўрапейскай культурнай сталіцай. Дарэчы, для гэтага краіна нават не абавязкова мусіць мець кандыдацкі статус, бо насамрэч штогод абіраюцца ажно тры такія «сталіцы»: адзін горад са «старой часткі ЭС», плюс адзін горад з новай краіны-сябра, і яшчэ адзін горад за межамі ЭС. Аднак у гэтым выпадку дзяржаве давядзецца самой укладаць немалыя сродкі, падключаць мясцовы бізнэс, каб прывесьці гарадзкую інфраструктуру ў належны стан — толькі тады ёсьць шанец атрымаць грошы ад ЭС.

> Мы пасьмейваемся з «Дажынак», хоць эўрапейцы таксама практыкуюць падобны падыход.

Невялікім культурніцкім праектам дапамогі ад ЭС чакаць не даводзіцца. Найменшы праект у праграме «Культура» мусіць мець мінімум тры партнэры з розных краінаў ды бюджэт 50 тысячаў эўра, пры гэтым Эўрасаюз дае толькі палову тых грошай. Рэшту мусяць даць ці дзяржава, ці спонсары, ці партнэры. Цікавы нюанс: падтрымліваюцца толькі такія культурніцкія праекты, на якія немагчыма знайсьці падтрымкі на нацыянальным узроўні. То бок, ідэя мусіць быць настолькі наднацыянальнай і міжнароднай, што адной канкрэтнай краіне іх падтрымліваць яе ці то бессэнсоўна, ці то занадта дорага. Значыцца, атрымаць з праграмы «Культура» грошы на ўнутраны культурніцкі праект, скіраваны, скажам, выключна на падтрымку беларускай мовы, наўрад ці ўдасца.

### Пасьля ўступленьня

Структурныя фонды ЭС могуць добра прыдацца для спрыяньня нашай матэрыяльнай культуры. Зь іх дапамогай можна будзе рэстаўраваць старыя часткі гарадоў ды мястэчак, аднаўляць музэі ды ствараць новыя, разьвіваць тэатры і г. д. Але гэта будзе рэальным у выпадку, калі дзяржава сама будзе даваць частку грошай на гэтыя праекты. А таксама тады, калі гэтыя культурніцкія праекты будуць рэальна паляпшаць дабрабыт людзей — найперш праз разьвіцьцё турызму ды сфэры паслугаў.

З структурных фондаў дапамагаюць не краінам, а канкрэтным рэгіёнам. Гэта значыць, што на практыцы змаганьне за грошы ЭС будзе ісьці не між Беларусьсю ды Гішпаніяй (напрыклад), а, скажам, паміж Гарадзеншчынай ды Андалюзіяй.

Існуе небясьпека, што ў будучыні ў ЭС узмоцніцца тэндэнцыя разглядаць культуру як індустрыю, якая мусіць забясьпечваць сябе сама ды не патрабуе адмысловай дзяржаўнай падтрымкі. У такім выпадку магутныя культуры, такія, як брытанская, француская ці нямецкая, будуць здольныя вытрымаць канкурэнцыю на культурніцкім рынку, а іншыя будуць выціснутыя на ягоныя ўскраіны. Беларускай культуры, асабліва ўлічваючы стан нашай мовы, давялося б у такіх умовах вельмі цяжка.

У любым выпадку, эўрапейскім мастакам ужо цяпер даводзіцца быць адначасова мэнэджэрамі, вучыцца шукаць грошы на свае праекты. Каб пасьпяхова займацца мастацтвам, даводзіцца быць прадпрымальнікам, набіваць сабе цану, намагацца зацікавіць мэдыі, трэніравацца ў напісаньні заявак у фундацыі на фінансаваньне сваіх праектаў. Сыстэма вытворчасьці культурніцкага прадукту, якая паўстае ў Эўропе, можа прывесьці да таго, што таленавітыя, але не прадпрымальныя мастакі будуць, як ніколі, безнадзейна загнаныя ў цень.

### Эўрасаюз і нацыянальная культура

Ці можна з дапамогай Эўрасаюзу разьвіваць беларускую нацыянальную культуру? З аднаго боку, адна з найноўшых эўрасаюзных тэндэнцыяў — разьвіцьцё шматмоўнасьці, найперш — падтрымка «слабых» моваў. Тут для Беларусі адкрываюцца неблагія пэрспэктывы. Аднак важна памятаць: галоўнае для Эўрасаюзу — не асобныя мовы, якімі б занядбанымі яны ні былі, а шматмоўнасьць як такая. Эўрапейская культура ствараецца як саюз розных культураў, якія маюць роўныя правы.

На беларускія культурніцкія праблемы Эўрасаюз глядзіць са сваёй званіцы. Клопат пра нацыянальныя культуры тытульных нацыяў (у тым ліку пра культуру беларусаў у Беларусі) — малацікавая для яго справа. Цяпер найбольш увагі надаецца разьвіцьцю культураў меншасьцяў, рэгіёнаў, а таксама іншых, неэўрапейскіх народаў, якія занялі сваё месца ў Эўропе дзякуючы эміграцыі. Гэтак, у бліжэйшай пэрспэктыве прыярытэт будзе надавацца супрацоўніцтву з мусульманскімі культу-



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Беларуская культура дагэтуль ня мае свайго выразнага «гандлёвага знаку» за мяжой.

**Горадня можа некалі стаць культурнай сталіцай Эўропы.**

рамі, якія атачаюць Эўропу па пэрыэмтры, а таксама з Балканамі. Усходнюю Эўропу, ня кажучы ўжо пра Расею, адкладаюць «на дэсэрт», а то ўвогуле на сьвятое ніколі.

Таму, калі Беларусь выйдзе на эўрасаюзную сцэну ды заявіць, што прыярытэт краіны — разьвіцьцё нацыянальнай беларускай культуры, то яе проста не зразумеюць. Іншая справа, калі Беларусь будзе прэзэнтаваць сябе як краіна з традыцыямі шматкультурнасьці, дэкляруючы клопат пра разьвіцьцё ня толькі беларускай, але і ўкраінскай, польскай, татарскай, габрэйскай ды іншых культураў.

Дарэчы, Кіеў праваліўся на выбарах эўрапейскай культурніцкай сталіцы-2009 менавіта таму, што ў конкурснай заяўцы абапіраўся найперш на прэзэнтацыю ўкраінскіх традыцыяў. Ягоны канкурэнт, Стамбул, наадварот, акцэнтаваў свае інавацыі ды шматкультурнасьць — і перамог. Імкнучыся да сяброўства ў ЭС, Турэччына вяслуе ў бок эўрапейскага шматкультурнага мэйнстрыму.

Часам адной кнігі дастаткова, каб зьмяніць жыцьцё цэлага гораду. У 2004 г. упершыню выйшаў па-ангельску раман узгаданага вышэй Архана Памука «Сьнег», дзе распавядаецца пра забытае ўсімі мястэчка Карс на поўначы Турэччыны. Хто чуў пра той Карс да Памука? А ўжо цяпер Эўрапейская фундацыя культуры распачала ў мястэчку свой праект. Хто б напісаў раман пра нашы Докшыцы ды атрымаў Нобэля?

## Шанец на зломе дзесяцігодзьдзяў

Чым часьцей Эўразьвяз паглядае ў бок стварэньня агульнаэўрапейскай «шматкультурнай культуры», тым больш актыўна многія эўрапейскія краіны ахоўваюць правы ўласных нацыянальных культураў.

Зьвязана гэта ня толькі з унутранымі праблемамі гэтых краінаў, але і з тым, што эўрасаюзныя структуры, якія раней былі толькі інструмэнтам, які каардынуе інтарэсы нацыянальных дзяржаваў, пачынаюць рабіцца аўтаномным палітычным арганізмам. Натуральна, ён імкнецца пашыраць сваю ўладу ды паўнамоцтвы. Культура, якая раней была маргінальным пытаньнем, у гэтым зьвязку робіцца надзвычай важным фактарам. Калі агульнаэўрапейская культура некалі сапраўды паўстане, Эўрасаюз як палітычная структура здолее набыць зь яе дапамогай дадатковую, культурніцкую легітымнасьць.

Эўрасаюз фінансуе праграмы захаваньня традыцыі драўлянага дойлідства і стварэньне электроннага архіву народнай музыкі.

Сёньня ўсе грошы на культуру ў Эўрасаюзе расьпісаныя да 2013 г., таму да гэтага часу вялікіх зрухаў чакаць ня варта. Прыняцьце згаданай вышэй новай культурніцкай стратэгіі Эўрасаюзу — гэта своеасаблівая артпадрыхтоўка да чарговага этапу змаганьня за культуру, які распачнецца тады, калі прыйдзе час вызначаць эўрасаюзны бюджэт на новую сямігодку. Гэтае змаганьне прыпадзе на 2011—2012 г. Цікава, што гэты час можа стацца паваротным для Беларусі, дзе мусяць прайсьці чарговыя прэзыдэнцкія выбары. У выпадку, калі атрымаецца вярнуць свабоду ў краіну, на мапе Эўропы зьнікне апошняя чорная палітычная пляма. Калі ж да гэтага часу стабілізуецца сытуацыя ва Ўкраіне і ў Малдове, і Беларусь разам зь імі пачне актыўна грукацца ў эўрапейскія дзьверы, то Эўрасаюз проста ня зможа нас ігнараваць. Магчыма, у пэўны момант нашыя краіны і структуры Эўрасаюзу змогуць нават зрабіцца саюзьнікамі ў палітычным супрацьстаяньні з тымі дзяржавамі, якія не жадаюць пашырэньня ЭС ды ўзмацненьня ролі наддзяржаўных органаў. У выпадку посьпеху Беларусь, Украіна і Малдова атрымаюць сяброўства ў ЭС, а Эўрасаюз сьцьвердзіць сваю новую ідэю адкрытай агульнаэўрапейскай культуры, далучыўшы да яе ўсход кантынэнту.

Разам з тым, само па сабе далучэньне да ЭС не прынясе беларускай культуры вялікай палёгкі. Грошай на культуру ЭС выдаткоўвае мала, і якая іх частка патрапіць у Беларусь, ня можа сказаць ніхто. У культурніцкім пляне галоўным аргумэнтам далучэньня Беларусі да ЭС зьяўляецца тое, што яно прынясе свабоду дзеяньняў, разьняволіць грамадзянаў ды зьвяжа па руках чыноўнікаў, прымусіўшы іх кіравацца больш-менш цывілізаванымі правіламі гульні і прыслухоўвацца да грамадзтва. Людзі культуры атрымаюць магчымасьць спакойна займацца сваёй справай, не хвалюючыся пра забароны, штрафы, суды ды турмы. Але варта памятаць, што справу тую за нас ніхто, тым больш Эўрасаюз, рабіць ня будзе.

*Брусэль*

Друкуецца скарочана. Поўны варыянт артыкулу чытайце на сайце www.nn.by

# Удзячнасьць — мастацтва душы, або Чаму беларусы ня ўмеюць дзякаваць?

Пачуцьцё ўдзячнасьці — аснова псыхалягічнага камфорту. Гэтае пачуцьцё не прыроджанае. Яго трэба выхоўваць. Піша **Янка Запруднік**.

*Найглыбейшая прага чалавека — гэта патрэба быць ацэненым.*
Аўтар невядомы



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Янка Запруднік**
адзін зь лідэраў беларускай дыяспары ЗША. Гісторык, журналіст. Жыве ў Сомэрсэце (Нью-Джэрзі).

Тэму гэтых развагаў падказалі нараканьні, якія можна пачуць тут, у Амэрыцы, ад знаёмых беларусаў, што за адасланыя ў Беларусь рэчы часта ня маюць ня тое што ні слова падзякі, а нават паведамленьня аб атрыманьні пасылкі. А пасылаецца вельмі шмат і вопраткі, і прадуктаў, і грошай, і розных іншых тавараў. Ды ня толькі з Амэрыкі, а й з Канады, Аўстраліі ды іншых краін. І ня дзеля падзякі, а з добрай волі, з разуменьня, што людзям патрэбная дапамога. Тыя, хто гэтую дапамогу дастае, трэба думаць, цэняць яе. Але вось напісаць ліст аб атрыманым, падзякаваць за дабро шмат у каго не выходзіць. І ўзьнікае загадкавае пытаньне — ЧАМУ МАЎЧАНЬНЕ? У чым сакрэт гэтай нематы? Займацца разгадкай чужое душы — заданьне даволі складанае, але ў дадзеным выпадку патрэбнае. І нават карыснае. Вось жа гляньма, як выглядае гэтая справа з амэрыканскага берагу.

У Амэрыцы ў штодзённым жыцьці паўсюдна гучаць словы: Thank you, thanks, I am grateful, I appreciate it (дзякую, падзяка, я ўдзячны, я цаню гэта). У гэтай краіне выказваньне падзякі, нават за найменшы жэст добразычлівасьці або ўвагі, сталася неад'емным элемэнтам культуры ўзаемадачыненьняў. Выказваньне падзякі гучыць і на вуліцы, і ў магазынах, і ва ўрадавых установах. Выказваецца падзяка таксама й пісьмова. Калі чалавек пабываў на нейкай важнай урачыстасьці або атрымаў падарунак ці яму зрабілі паслугу, ён у шмат якіх выпадках дзякуе пісьмова. Для палягчэньне такога кроку прадаюцца адмыслова надрукаваныя карткі падзякі (Thank you Notes). Амэрыканцы кажуць «дзякую» за ўсякую паслугу, нават за камплімэнт:

— У вас прыгожыя завушніцы.
— Дзякую.

Дзякуюць за пахвалу:
— У вашай хаце вельмі ўтульна.
— Дзякую.

Дзякуюць за ветлівасьць у чарзе:
— Калі ласка, праходзьце.
— Дзякую.

Беларусам, што прыяжджаюць у Амэрыку на пабыўку, гэта здаецца дзіўным. Адна мая знаёмая, калі прыехала ў адведкі й пачула ў дачыненьні да сябе «thank you» ад жанчыны, якой яна саступіла дарогу ў магазыне, зьдзіўлена папыталася: «А за што яна мне падзякавала!?» Давялося тлумачыць, што ў Амэрыцы дзякуецца нават за жэст ветлівасьці.

Тэма ўдзячнасьці — адвечная. Яна ня толькі адлюстраваная ў Бібліі — удзячнасьць Богу за жыцьцё, за дары зямныя. Яе асэнсавалі вялікія мысьляры старажытных Грэцыі й Рыму. Гэтак, старажытнарымскаму красамоўцу Сэнэку належыць фраза «Няма нічога больш высакароднага за ўдзячнае сэрца». Нехта склаў трапную сэнтэнцыю на манер Хрыстовай Нагорнай пропаведзі: Дабрашчасныя тыя, што могуць даваць, не запамінаючы, **і атрымліваць, не забываючыся**. Шмат залатых думак выказана на тэму ўдзячнасьці, якая як нішто іншае, ўшляхотнівае міжлюдзкія дачыненьні.

У Амэрыцы тэма ўдзячнасьці грун-

тоўна распрацаваная псыхолягамі й пэдагогамі. Патрэба выказваньня ўдзячнасьці ўкарэньваецца ў штодзённым абыходку. Ёй прысьвячаюць увагу бацькі, настаўнікі, сьвятары, прапаведнікі. Літаратура на тэму ўдзячнасьці бясконца багатая як у інтэрнэце, гэтак і ў бібліятэках ды кнігарнях. Шырокай папулярнасьцю апошнімі гадамі карыстаецца кніга прафэсара псыхалёгіі Каліфарнійскага ўнівэрсытэту Робэрта Эманза (Emmons) «Псыхалёгія ўдзячнасьці». Эманз амаль дваццаць гадоў вывучаў псыхалёгію задаволенасьці/шчасьця. І прыйшоў да высновы, што важную ролю ў духовым камфорце чалавека выконвае пачуцьцё ўдзячнасьці. Але пачуцьцё гэтае не прыроджанае. Яно не прыходзіць само сабой, не закладзена ў генах, яго трэба культываваць.

«Вельмі важна падкрэсьліць, — кажа

Альбэрт Швайцэр: Нічога ня робіцца само сабой. За ўсім стаіць жаданьне дабра, якое накіравана на цябе.

Эманз, — што быць удзячным — гэта справа выбару. Удзячнасьць — гэта стаўленьне, якое мы можам выбраць, ад якога паляпшаецца й наш побыт, і побыт іншых людзей». Чым больш прафэсар Эманз заглыбляецца ў гэтую тэму, тым больш прыходзіць да перакананьня, што ўдзячнасьць — найлепшы падыход да жыцьця. Удзячнасьць, — кажа ён, — гэта мастацтва душы.

Якія парады дае вучоны бацькам і настаўнікам на культываваньне ў дзяцей, моладзі пачуцьця ўдзячнасьці? Некаторыя спосабы вядомыя даўно: быць прыкладам у паводзінах, выказваць бацькоўскую ўдзячнасьць, пасылаць пісьмовыя падзякі сваякам за падарункі, дзякаваць настаўнікам і тым, хто ў чымсьці дапамагае. Дапамагаюць іншыя канкрэтныя акты, як малітвы ўдзячнасьці за сталом або перад сном.

Пэдагогі раяць студэнтам псыхалёгіі весьці адпаведны дзёньнік і запісваць у яго ўсе моманты адчуваньня ўдзячнасьці за атрыманыя рэчы або ўчынкі. Як вынік такой практыкі, па пэўным часе ў студэнтаў зьмяншаецца адчуваньне, што ўсё атрыманае імі НАЛЕЖЫЦЬ ім. Яны пачынаюць лепш разумець, што за ўсякім добрым учынкам стаіць нечыя добразычлівасьць. У іх зьмяншаецца пачуцьцё эгаізму. Псыхалёгія сьведчыць, што культывуючы пачуцьцё ўдзячнасьці, павышаеш здольнасьць зьвяртаць увагу на тое, **што** табе дадзена ў падарунак.

Выдатны гуманіст і дабрачынец, ён жа ляўрэат Нобэлеўскае прэміі, Альбэрт Швайцэр мудра зазначыў: *«Выхаваць у сабе пачуцьцё ўдзячнасьці — значыць нічога ня браць за належнае, але заўсёды знайсьці й ацаніць тое,* ***што*** *за гэтым стаіць. Нічога ня робіцца само сабой. За ўсім стаіць жаданьне дабра, якое накіравана на цябе. Прывучы сябе ніколі не адкладаць словы ці ўчынак, каб выказаць удзячнасьць».*

Досьледы паказваюць, што пачуцьцё ўдзячнасьці дадае суб’ектыўнага адчуваньня духовага дабрабыту. Апрача ўсяго, ад пачуцьця ўдзячнасьці — удзячнасьці за нагоду — можа нараджацца таксама ўсьведамленьне магчымасьці быць карысным свайму бліжняму (Маці Тэрэза) або свайму народу (патрыятызм, самаадданасьць нацыянальнай справе).

На ўдзячнасьць у ангельскай мове ёсьць некалькі слоў — *gratitude, gratefulness, thankfulness.* Гэтае апошняе мае рэлігійнае адценьне — удзячнасьць Богу. Амэрыканцы штогоду адзначаюць у апошні чацьвер лістапада традыцыйнае сьвята Thanksgiving Day (Дзень Падзякі). Традыцыя гэтая, што бярэ свой пачатак ад першых эўрапейскіх пасяленцаў тут, таксама ўмацоўвае пачуцьцё ўдзячнасьці й выказваньня яе ў дачыненьні да іншых.

Пра беларусаў наагул ніяк ня скажаш, што яны няўдзячныя. Але шмат у каго зь іх удзячнасьць нейкая палавінчатая. Яна, калі ёсьць, дык недзе ўнутры, у душы. Нейкія псыхалягічныя бар’еры перашкаджаюць ёй выйсьці навонкі, дайсьці да таго, каму яна належыць і хто рады быў бы яе пачуць.

У чым сакрэт? Прычыны тут могуць быць розныя. Адна зь іх — беднасьць. Хоць кажуць, што беднасьць — не загана, але яна гняце душу, ятрыць раны. І жэст падарункам з боку багацейшага амэрыканскага суродзіча закранае гэтую рану. У дадатак да ўсяго савецкая ўлада прывучыла людзей паўтараць: «У нас усё ёсьць». Адсюль рэакцыя на падарунак: «Я ж не жабрак/жабрачка; мы не бяднейшыя». Падарунак успрымаецца як падачка, а ня як выява добразычлівасьці. Безумоўна, чалавеку з такім мэнталітэтам варушыць гэтую рану, пішучы падзяку, даволі пакутліва. Лепш прамаўчаць.

Ёсьць і іншыя прычыны няўдзячнасьці.

Часамі выглядае, што карыстальнік дабра не здабываецца на падзяку, бо бачыць у ёй нейкае прыніжэньне свае асобы. Дзякаваць для яго — гэта як быццам бы прызнаваць сваю залежнасьць ад дабрадзея, паказваць сваю слабасьць. Такое йдзе ад ганарлівасьці. Амэрыканскі прапаведнік XIX стагодзьдзя Генры Ўорд Бічэр трапна падмеціў гэты заганны бок характару: *«Ганарлівы чалавек рэдка бывае ўдзячным чалавекам, бо ён ніколі ня думае, што яму дастаецца гэтулькі, колькі ён заслугоўвае».* А выказваньне ўдзячнасьці якраз спрыяе перамозе над ганарлівасьцю. Бо чым больш думаеш, што атрыманае ў падарунак **належала** табе, тым меншая магчымасьць, што ты будзеш удзячны за яго. Але калі ты сьціплы, калі разумееш сваю абмежаванасьць, тады больш шансаў, што атрыманае будзеш уважаць за падарунак

Удзячнасьць паляпшае наша самаадчуваньне і побыт іншых людзей.

і будзеш удзячны ахвярадаўцу.

Няўдзячнасьць ідзе й ад карысьлівасьці як выніку савецкай бездуховасьці й матэрыялізму. Вось прыклад. Некаторыя з нас у Амэрыцы выдаткоўвалі час і грошы, каб дапамагчы незнаёмаму суродзічу ў атрыманьні палітычнага прытулку. Дапамога давалася з думкай-надзеяй, што чалавек далучыцца да свае грамады, будзе нечым карысны ёй. Аказваецца, спадзяваньні былі дарэмнымі. Думаецца, шмат хто з такіх карыстальнікаў дабра патурбаваўся падзякаваць, хоць бы па тэлефоне, за намаганьні й выдаткі? Скончылася судовая справа — скончыўся кантакт. Чалавек зьнік, як у ваду кануў. Зьнікае й ахвота дапамагаць такім.

Пішучы пра ўсё гэта, я меў на ўвазе ня толькі маральны й этычны аспэкты праблемы, але й прагматычны бок дзеля дабра тых жа землякоў, што патрабуюць дапамогі. Паміж давальнікам і атрымальнікам павінен быць жывы кантакт. Трэба разумець важнасьць яго. І ягоную ролю ў стымуляваньні далейшае дапамогі з боку давальніка. Дапамога будзе тым больш спраўнай і шчодрай, чым лепш будуць разумець тыя, каму яна даецца, важнасьць псыхалягічнага й этычнага боку акту дабрадзейства.

# Грузія безь дзьвюхкосьсяў



Працяг са старонкі 16.

гарачага хлебу са старых печаў і духмянае кавы па-турэцку.

Засьмечаныя падземныя пераходы, у якіх віруе натоўп бедных людзей, дзясяткі жабрачак у чорных уборах і навязьлівых цыганятаў, закінутыя савецкія спаруды, што пераўтвараюцца пакрысе ў небясьпечныя руіны, суседзяць тут зь сядзібамі, што туляцца да замкавых муроў, у засені садоў і гародаў, зь незьлічонымі старажытнымі храмамі, з шыкоўнымі будынкамі музэяў, тэатраў, урадавых установаў, банкаў і гатэляў.

## Ратуе крэўнасьць

Тбіліскія кавярні й крамы выглядаюць ня горай за праскія ці віленскія. А асартымэнт у іх больш разнастайны. Але параўноваць узровень жыцьця не выпадае, бо тут іншая сыстэма каштоўнасьцяў. Самай вялікай каштоўнасьцю тут ёсьць уласны лапік зямлі, што добра можа пракарміць, ды прасторны вялікі дом, прадмет асаблівага гонару... У Тбілісі чалавек можа жыць у трохсотгадовым доме, хадзіць у агульную прыбіральню на вуліцы, але езьдзіць на навюткім джыпе. Кухар у прыдарожнай кавярні можа зарабляць пад 800 даляраў, але ўтрымліваць старых бацькоў ды тузін сваякоў. Зь іншага боку, бядотныя бабці-ўцякачкі з зоны канфліктаў, атрымліваючы блізу 30 даляраў, робяць часам манікюр, п'юць выдатную каву й штодня ядуць садавіну...

Тут вельмі магутныя пачуцьці крэўнасьці, сваяцтва, суседзтва. Яно ратуе ўсіх, трымае на паверхні. Не дае засьціся ў душы сумневу ці роспачы.

## Дыхаць стала лягчэй

«Дур-р-рак Саакашвілі! Дур-р-рак! Пэнсіі не падвышае, заробкі не падвышае. Толькі паліцэйскім. Каб парадак быў. Цяпер спакойна стала. Бачыш машыны пад вокнамі стаяць? Раней запраста так не пакідалі. Чысьцей стала. Значна чысьцей. Вуліцы ўпрыгожылі. Сьвятла стала болей. Лепей жыць стала. Маладзэц Саакашвілі! Маладзэц!» — кажа старая кабета, уцякачка з Абхазіі. Яе супярэчлівае меркаваньне вельмі тыповае. Дзясяткі тысячаў уцекачоў з Паўднёвай Асеціі і Абхазіі спадзяюцца на скорае разьвязаньне сваіх праблемаў, на вяртаньне дахаты. Іхны боль і іхны голас шмат вызначае тут.

Будаўнік сярэдняга веку, які зарабляе болей за тысячу даляраў, гадуе пляменьнікаў ды даглядае бацькоўскія магілы, пакуль сястра працуе ў Грэцыі, казаў, што дыхаць тут стала лягчэй. Ніхто цяпер не спыняе проста на вуліцы, патрабуючы дакумэнты: «Як завуць? Дзе працуеш?» З газэтаў можна дазнацца цяпер амаль пра ўсё. Можна не баючыся галасна казаць, што думаеш. «Дэмакратыя? Гэта як вада — цяпер піць ня прагнеш, але прагнеш пэўнасьці, што як спатрэбіцца, то вада будзе пад рукою…», —кажа мой выпадковы знаёмы.

«А вы, беларусы, што? Лукашэнку нанялі, цяпер звольніць ня можаце?» — таксама тыповае меркаваньне грузінаў пра Беларусь. Зрэшты, гэта амаль усё, што яны могуць сказаць пра Беларусь. Тыя, каму меней трыццаці гадоў, зазвычай слаба сабе ўяўляюць дзе нашая краіна наагул. Некаторыя, дазнаўшыся, што я не з Расеі, а зь Беларусі, спрабуюць гаварыць па-ангельску. А таксіст, зь «веданьнем» справы, перапытваецца: «Менск? Гэта на Ўкраіне, так?»…

## Азіяцкі час

Грузія — краіна ў Азіі. Справа ня толькі ў картаграфічай дадзенасьці. Азіяцкасьць тут вызначаюць час і месца. Час тут цячэ як мёд. Немаведама, дзе скончылася мінулае, а дзе пачалося, не пачаўшыся, будучае… Людзі абмяркоўваюць навіны, якім два месяцы, а пра Прамэтэя-Амірані, Мэдэю і Язона, царыцу Тамару і цара Давіда могуць распавядаць зь лёгкасьцю, нібы пра сваіх сваякоў, сьведкамі біяграфіяў якіх яны былі самі…

Усё, што можна адкласьці на заўтра, тут адкладаюць. Альбо наадварот. Калі банк працуе зь дзясятай гадзіны, гэта ня значыць, што ў яго не запусьцяць на гадзіну раней. Палова людзей выходзіць на працу тады, калі другая палова кладзецца спаць. У выніку, людзкое жыцьцё не замірае тут у гарадах ні на гадзіну…

## У Эўропу — толькі паветрам

Месца на зямлі. Для Грузіі яно вызна-



чае амаль усё. На поўначы цяпер ужо канчаткова варожая Расея, што акупавала вялікія анклявы Абхазіі й Паўднёвай Асеціі. Адтуль, з-за расейскае мяжы, залятаюць часам ваенныя самалёты, пранікаюць тысячы ўцекачоў ад «зачыстак» расейскіх карнікаў. Адтуль штотыдзень прывозяць труны забітых расейскімі «хуліганамі» грузінаў… На ўсходзе Грузіі — ваюючыя міжсобку Азэрбайджан і Армэнія, а на Поўдні — вялізарная Турцыя, Курдыстан. Шляху па зямлі з Эўропы ў Грузію цяпер проста няма. Жывыя людзкія кантакты з эўрапейцамі ў Грузіі зьведзеныя да мінімуму. Хоць навязваюцца, ці, дакладней сказаць, аднаўляюцца, спрадвечныя кантакты з Грэцыяй і Кіпрам, дзе працуюць дзясяткі тысячаў грузінаў, з блізкай Турцыяй, што адчуваецца на кожнай вуліцы, па шыльдах крамаў і кавярняў, і, нават, цырульняў. Вельмі моцная існуе тут повязь з Ізраілем, Лібанам, Ярданіяй. І, натуральна, з Армэніяй, адкуль прыязджаюць штодня дзясяткі тысячаў людзей на заробкі й на адпачынак да мора. Расейская надаецца хіба ўжо толькі тут. І тое, усё меней...

## «Міша, Міша!»

Грузінская кухня вымагае паважнасьці й душэўнае раўнавагі. Сядзеў на начным бульвары ў Батумі, спажываў сабе смакоцьце, слухаў мора. Памаранч сонца закаціўся вельмі хутка. Раптам ад лілёвых ценяў адлучыліся збройныя людзі ў чорным. Міма майго століка, з грукаценьнем, шоргатам галькі, упэўненым подбегам імпэтна рушыў чалавек у белым гарнітуры. Ён весела й упэўнена махаў рукою людзям на начным пляжы. Я, у адказ, мэханічна, але з той сардэчнасьцю, да якое міжволі прызвычайваесься на Каўказе, памахаў яму ў адказ. Ледзь пасьпяваючы за чалавекам у белым, сьпяшаўся натоўп шэрых цывільных, таксама ў гарнітурах, а за імі, выгінаючыся хваляю, перабежкамі, перамяшчаліся чорныя людзі са зброяй. «Міша, Міша, Міша!» — узбуджаныя людзі за столікамі прыўзьнята абмяркоўвалі ўбачанае. «Вы зь ім знаёмыя?» — радасна запыталася прадавачка. «Не, проста вітаемся, — адказаў я. — А хто гэта?» — «Саакашвілі!»

Я занурыўся ў сваю талерку, спрабуючы разабрацца ў букеце прысмакаў, пакуль не пастыла... А ў Батумі ніхто нават і ня ведаў, што прыяжджаў прэзыдэнт. І цэнтар гораду не перакрывалі, і выпадковых людзей там не баяліся. Не было сырэнаў, ачапленьняў, напругі, шоў з камэрамі. Так, прыехаў праве-



рыць справы, некаму нешта паказаў і малазаўважна зьехаў.

## Госьць дзеля радасьці

Грузінская кухня — гэта канстанта нязьменная. «Віно, хлеб і сыр — падстава народнае самапавагі»,— пішуць у тутэйшых даведніках. Безумоўна, гэта праўда. Прыемна знайсьці старую кавярню-трамвайчык, пад самым мурам старога гораду, дзе піў такую ж каву дваццаць гадоў таму. Хораша завітаць у тую ж сталоўку пад пальмамі, дзе вырабляюць найсмачнейшы суп-харчо й тыя ж сачыстыя хінкалі, што й у далёкія савецкія часы. І сустрэць тыя ж тыпажы й тую нязьменную гасьціннасьць, што радасна б'е праз край, як пеністая сапраўдная вада Баржомі.

Тут госьця частуюць ад сэрца чужыя людзі, дзеля радасьці людзкага кантакту. У гэтай непарыўнасьці традыцыяў і годнай самапавазе — сутнасьць грузінскага характару. На гасьцінную шчырасьць, без мэркантылізму, здатныя толькі людзі, свабодныя ўнутры.

Гэтае п'янкое пачуцьцё ўнутранае свабоды й згоднае раўнавагі, упэўненасьці ў будучыні захоплівае. Грузіны ня ганьбяць сваіх правадыроў. Пра Сталіна гавораць са справядлівай пэўнасьцю, што гэта самы славуты грузін у гісторыі, Зьвіяда Гамсахурдзія называюць бязь ценю патэтыкі героем і называюць ягоным імем цэнтральныя вуліцы, Шэварднадзэ спачуваюць, шануючы як старога дзядзьку, які зрабіў магчымай рэвалюцыю ружаў. Гэтак кажуць і старыя й зусім маладыя. Хрысьціяне й мусульмане. Так, яны вымаўляюць слова Рэвалюцыя цьвёрда, безь дзьвюхкосься…

**Здымкі аўтара**

# Сьвет не загіне ад перанасяленьня

У Эўропе адмірае інстытут шлюбу, у Амэрыцы ён моцны, у Афрыцы праз дзесяць гадоў спыніцца эпідэмія СНІДу, а ў Азіі — рост насельніцтва. Беларусі ж пагражае дэмакратура пэнсіянэраў і ўтрыманцаў. Гутарка з польскім дэмографам **Маркам Акульскім**.

**— 30 год таму дэмографы палохалі перанасяленьнем сьвету. Сёньня можна пачуць пра нэгатыўныя вынікі нізкага натуральнага прыросту. Чаму радыкальна зьмяніліся прагнозы?**

**Марэк Акульскі:** Гэта не дэмографы палохалі. Так, у 60-я узрастала гістэрыя вакол г.зв. бомбы D. Зьявіліся малюнкі, дзе перанасяленьне выяўлялася ў форме атамнага грыбу. Але малявалі іх не дэмографы. Страх дэмаграфічнай катастрофы пашыралі, хутчэй, публіцысты. Аднак пасьля Мальтуса [Томас Робэрт Мальтус, брытанскі эканаміст, памёр у 1834 г.] ніводзін сур'ёзны дэмограф не заяўляў, што колькасьць насельніцтва павялічваецца ў аднолькавым тэмпе. У сярэдзіне XX ст. дэмографы лічылі, што перанасяленьне Зямлі стабілізуецца на ўзроўні 11—12 млрд. Сёньня яны крыху скарацілі свае прагнозы — лічыцца, што максымальная колькасьць насельніцтва складзе 9—10 млрд.

**— У пэўны момант колькасьць насельніцтва перастане расьці? Чаму?**

— Гэта вынікае з тэорыі дэмаграфічнага пераходу. Цягам большай часткі гісторыі нараджальнасьць была вельмі высокай. Так мусіла быць, каб папуляцыя выжывала, нягледзячы на высокую сьмяротнасьць. Аднак у пэўны момант сьмяротнасьць падае — у выніку мадэрнізацыі, у тым ліку і росту ўзроўню жыцьця, паляпшэньня гігіены, лепшага харчаваньня — пакуль не становіцца вельмі нізкай. Пачынае скарачацца і нараджальнасьць. Падчас гэтых зьменаў грамадзтва, аднак, праходзіць этап, калі ўсё яшчэ захоўваецца вельмі высокая нараджальнасьць, хаця сьмяротнасьць скарачаецца. У выніку натуральны прырост робіцца сьпярша вельмі высокім, а пасьля пачынае падаць, аж да нуля.

У Эўропе гэты этап праходзіў без асаблівых праблемаў, бо дэмаграфічныя зьмены адбываліся цягам многіх год, да таго ж нашаму кантынэнту было куды высылаць лішак насельніцтва. Аднак калі ў 50-х і 60-х гг. мінулага стагодзьдзя краіны Трэцяга Сьвету пачалі ўваходзіць у этап хуткага дэмаграфічнага прыросту, шмат якія палітыкі пачалі баяцца. Іншыя кантынэнты былі не гатовыя прыняць такую армаду людзей, а зь іншага боку, не было разуменьня, што дэмаграфічныя працэсы ў краінах Трэцяга Сьвету праходзяць больш інтэнсіўна, чым у Эўропе, — г.зн. экспансія адбываецца раптоўна, але будзе доўжыцца меней часу.

**— Дзьве найбольш населеныя краіны сьвету — Кітай і Індыя — доўгія гады праводзілі актыўную, часам брутальную, палітыку абмежаваньня натуральнага прыросту.**

— І дарма. У 60-я амэрыканцы пачалі прапагандаваць на форуме ААН праграмы дапамогі слаба разьвітым краінам, **ставячы іх у залежнасьць** ад абмежаваньня натуральнага прыросту насельніцтва. Індыя рэалізоўвала дарагія праграмы стэрылізацыі насельніцтва, яны выклікалі сацыяльнае напружаньне, а выніку ня мелі ніякага. Калі іх адракліся, здавалася, што ўрад нічога ня здольны зрабіць, прырост аўтаматычна пачаў скарачацца. Спрычыніліся працэсы мадэрнізацыі.

Сёньня мы маем справу з адваротнай праблемай. Шмат у якіх эўрапейскіх краінах, а таксама ў Кітаі, дэмаграфічныя паказьнікі ўпалі ніжэй за ўзровень, які гарантуе простую рэпрадукцыю — гэта ўжо **няпоўнае** ўзнаўленьне колькасьці насельніцтва ў наступным пакаленьні.

**— Да чаго гэта прывядзе?**

— Адбудуцца вялізныя зьмены ў дэмаграфічнай структуры. Калісьці насельніцтва ў рэпрадукцыйным узросьце — што амаль раўназначна працоўнаму ўзросту — складала каля паловы папуляцыі. Амаль палова зь іх была моладзь і дзеці, старых было вельмі мала. Сёньня шмат у якіх краінах Эўропы мы набліжаемся да становішча, калі постпрадукцыйная група большая за дапрадукцыйную.

**— Калі гэтая тэндэнцыя захаваецца, ці змогуць грамадзтвы функцыянаваць?**

— Безумоўна, не. Людзі ў эўрапейскіх краінах маюць чаканьні адносна ўзроўню жыцьця і сацыяльных стандартаў. Калі ж будзе захоўвацца перавага асобаў у постпрадукцыйным узросьце, і ня будзе дазваляцца наплыў імігрантаў, дойдзе да спробаў абмежаваць прывілеі пэнсіянэраў і ў выніку — да сацыяльнага канфлікту. Калісьці Пэтэр Друкер, выбітны спэцыяліст у мэнэджмэнце, перасьцерагаў: «Вы, маладыя, у пройгрышнай пазыцыі, бо, пакуль не ліквідуецца дэмакратычная сыстэма, мы, старыя, не дамо адабраць у нас прывілеяў». Адзіны спосаб пазьбегнуць канфлікту — павялічыць паказчыкі нараджальнасьці.

**— Ня думаю, каб пад уплывам Друкера маладыя зьмянілі прыхільнасьці і стыль жыцьця. Сёньня яны ўсё часьцей хочуць мець максымум адно дзіця.**

— Галоўная праблема — не велічыня папуляцыі, а яе структура. Праблемы пачнуцца тады, калі занадта зьменшыцца колькасьць людзей рэпрадукцыйнага ўзросту і павялічыцца колькасьць пэнсіянэраў. Гэта праблема ня толькі Эўропы. Сытуацыя яшчэ горшая ў Расеі, а хутка тое ж будзе і ў Кітаі.

Паказьнікі нараджальнасьці ў Кітаі скараціліся ніжэй за ўзровень, неабходны для ўзнаўленьня папуляцыі. Афіцыйны паказьнік дзетнасьці — колькі дзяцей нараджае жанчына на працягу свайго жыцьця — складае там 1,8. Паводле ж незалежных дасьледаваньняў — 1,5. Гэты паказьнік павінен складаць прынамсі 2,1, каб папуляцыя магла ўзнаўляцца. Ніжэй за два ён упаў ужо пры канцы 70-х гг, толькі што ніхто не зьвяртаў увагі, бо ў Кітаі жыве больш за мільярд людзей. За некалькі дзясяткаў год у Кітаі зьявіцца вялізная колькасьць старых. Трэба будзе знайсьці грошы на іх утрыманьне.

**— А Расея?**

— Гэта краіна, дзе на працягу бліжэйшых 25—30 гадоў колькасьць насельніцтва зьменшыцца недзе на 30%. Паўстагодзьдзя таму ў Расеі

**Марак Акульскі**

дэмограф, кіраўнік Цэнтру дасьледаваньняў міграцыяў і Катэдры дэмаграфіі Варшаўскага ўнівэрсытэту, выкладчык Вышэйшай школы сацыяльнай псыхалёгіі.




**Шлюб робіцца ўсё больш рэдкай зьявай.**

жыло ў дзесяць разоў больш людзей, чым у Віетнаме. Праз 50 гадоў будзе менш. Гэта азначае маргіналізацыю. Краіна, дзе так моцна зьмяншаецца насельніцтва, ня можа заставацца палітычна магутнай.

**— Некаторыя прадбачаць экспансію кітайскага насельніцтва ў Сыбір і ісламскага — у сярэдзіну самой Расеі. Гэта рэальна?**

— Сёньня гэтая каляніізацыя пашыраецца і адбываецца з блаславеньня расейскіх губэрнатараў. Аднак у хуткім часе Кітай будзе мець праблемы з сваёй дэмаграфіяй, і ня думаю, каб быў здольны экспартаваць вялікія лішкі насельніцтва.

З ісламам іншая гісторыя. Эўрапейскі досьвед паказвае, што мусульманскія эмігранты, хоць і маюць праблемы з культурнай адаптацыяй, вельмі хутка пераймаюць дэмаграфічныя мадэлі грамадзтва, у якім яны «гасьцююць». У сваіх краінах яны захоўваюць высокую нараджальнасьць, аднак пасьля перасяленьня ў Эўропу зьмяняюць мадэль сям'і на эўрапейскую. Яшчэ ў часы СССР шмат у якіх азіяцкіх рэспубліках назіралася незвычайнае скарачэньне дзетнасьці, хаця яны і не былі так сэкулярызаваныя, як Расея.

**— Вы намякаеце, што ня маюць рацыі францускія палітыкі і публіцысты, якія сьцьвярджаюць, што праз некалькі дзясяткаў год у іх краіне будзе дамінаваць прышлае мусульманскае насельніцтва?**

— Ня маюць. У мусульманскіх сем'ях нараджаецца болей дзяцей, чым у сем'ях карэнных французаў, але тэндэнцыя не захаваецца. Сем'і імігрантаў вельмі хутка прыстасоўваюцца да мадэлі, што дамінуе ў Францыі. У апошнія 30 год нараджальнасьць мусульманскіх сем'яў скарацілася ўдвая — з шасьці дзяцей да прыкладна трох.

**— Чаму ЗША маюць лепшыя дэмаграфічныя паказьнікі, чым Эўропа?**

— Найбольш імавернае тлумачэньне — ЗША не занялі паў дух сям'і, што, пэўна, зьвязанае з пратэстанцкімі каранямі гэтай краіны.

**— Як будзе выглядаць папуляцыя сьвету пры канцы XXI ст.?**

— Дэмаграфічныя прагнозы, падрыхтаваныя пад эгідай ААН, не сягаюць у такія далёкія часы. Але ёсьць усебаковыя прагнозы да 2050 г. У сярэдзіне стагодзьдзя краінай з найбольшай колькасьцю насельніцтва будзе Індыя. Кітай апусьціцца на другое месца. У першай дзясятцы апынуцца некалькі афрыканскіх краінаў: Нігерыя, Конга. У другой дзясятцы будуць Уганда, Этыёпія, Эгіпэт. Афрыка будзе кантынэнтам з самым хуткім ростам колькасьці насельніцтва. У сярэдзіне XX ст. Эўропа была ў тры разы больш населеная, чым Афрыка, у сярэдзіне XXI у Афрыцы будзе жыць у два разы болей людзей, чым у Эўропе. Праз дзесяць год эпідэмія СНІДу ў Афрыцы спыніцца, скароціцца сьмяротнасьць.

**— Гэта вельмі аптымістычная інфармацыя. Мы звыклыя чуць больш трывожныя прагнозы.**

— Гэта, канечне, адбудзецца ня заўтра — але адбудзецца. Гэткая папросту дынаміка кожнай эпідэміі.

**— Некалі вёска была асноўнай крыніцай натуральнага прыросту. А як сёньня?**

— Сацыяльныя зьмены адбываюцца там хутчэй, чым у горадзе. Калі гаворка ідзе пра колькасьць пазашлюбных дзяцей, на першым месцы ў Польшчы знаходзіцца ня горад, а заходнепаморская вёска. Там нараджаецца прапарцыйна болей пазашлюбных дзяцей, чым, напрыклад, у Варшаве. Даўней, калі 16- ці 18-гадовая дзяўчына ў вёсцы зацяжарвала, сям'я схіляла маладых да шлюбу і ладзіла шумнае вясельле. Нараджалася першае дзіця, пасьля наступнае. Сёньня бацькі такой дзяўчыны лічаць за лепшае ўтрымліваць дачку зь дзіцём, чым дадаткова яшчэ беспра-

# Сьвет не загіне ад перанасяленьня

цоўнага зяця. Так, дарэчы, дасьледаваньні, праведзеныя ў Вугоршчыне, даводзяць, што фактарам, які стрымлівае многіх маладых перад шлюбам, ёсьць вялізныя выдаткі на вясельле.

**— Значыць, мы асуджаныя на далейшае зьмяншэньне паказьнікаў нараджальнасьці, старэньне і зьмяншэньне грамадзтва?**

— Цяжка адназначна прадвызначыць. У апошніх кварталах 2005 г. і на пачатку мінулага — гэта апошні пэрыяд, за які мы маем дэталёвыя дадзеныя — можна заўважыць лёгкае павелічэньне колькасьці нараджэньняў і шлюбаў. Ня выключана, што паказьнік нараджальнасьці паволі павышаецца. Менш дзяцей нараджаюць больш маладыя жанчыны, а расьце колькасьць нараджэньняў сярод жанчынаў, якім болей за 26 год. Проста павялічыўся ўзрост заключэньня шлюбаў і нараджэньня дзіцяці.

**— Ці дэмаграфічная палітыка, накіраваная на павелічэньне колькасьці нараджэньняў, можа быць пасьпяховай? У Польшчы асноўным прыкладам такой палітыкі зьяўляецца Францыя.**

— Гэта ня так проста. У мінулым годзе паказьнік нараджальнасьці перавысіў у Францыі магічную мяжу дваіх дзяцей на сям'ю, аднак больш дакладныя дадзеныя паказваюць, што сярод карэнных францужак ён ужо шмат год стабільны і выразна ніжэйшы за два, затое выразна вышэйшы ў сем'ях імігрантаў.

Францыя, дэмаграфічныя праблемы якой пачаліся яшчэ да II Усясьветнай вайны, ажыцьцяўляла ў 30-х гг. палітыку павышэньня нараджальнасьці. У 1938 г. быў прыняты сямейны кодэкс, які забараняў аборты і абмяжоўваў магчымасьць разводаў. Разам з гэтым была ўведзеная дапамога сем'ям, што прызначалася перадусім шматдзетным сем'ям. Вынікі гэтай палітыкі былі мінімальныя.

**— Нават у бяднейшых сем'ях?**

— Так. У бяднейшых сем'ях часта нараджаецца болей дзяцей, але гэта вынікае зь ніжэйшага ўзроўню адукацыі, што выклікае менш пасьпяховае прымяненьне розных мэтадаў рэгуляваньня нараджэньняў.

**— Хіба няма аніякага спосабу, каб схіліць людзей да нараджэньня дзяцей?**

— Можна было б разглядаць якія-небудзь аўтарытарныя сродкі, чаго, канечне, не рэкамэндую. У 1966 г. дыктатар Румыніі Мікалае Чаўшэску ўвёў забарону абортаў і жорсткае пакараньне для дактароў за перапыненьне цяжарнасьці, уключаючы і сьмяротнае пакараньне. Жанчыны ў генэратыўным узросьце павінныя былі безупынна рабіць гінэкалягічныя дасьледаваньні, якія выяўлялі, ці яны цяжарныя. Эфэкт быў неверагодны. Колькасьць нараджэньняў узрасла з 600 тыс. да мільёна, а праз чатыры гады — зьнізілася да 500 тыс. Нягледзячы на жорсткія рэпрэсіі, румынкі не пачалі нараджаць болей дзяцей. А гэты аднагадовы ўзрост нараджэньняў шмат год заставаўся праблемай. Трэба было для дзяцей таго году нараджэньня падвоіць колькасьць месцаў у школах, унівэрсытэтах, колькасьць працоўных месцаў.

У нармальнай краіне жанчына самастойна ці разам з партнэрам прымае рашэньне пра нараджэньне дзіцяці і нельга яе схіліць да рашэньня, што супярэчыць ейнай волі. Калі яна будзе мець патрэбу завесьці дзяцей, то яна іх народзіць. Некалі эканамічныя прычыны вызначалі неабходнасьць мець шмат дзяцей. Гаворка ішла як пра рукі для працы па гаспадарцы, так і пра апеку над старымі бацькамі. Сёньня гэтыя матывы зьніклі. Застаецца верыць, што інстынкт захаваньня віду дастаткова моцны, каб чалавецтва не перастала размнажацца.

**Пераклала Вольга Данішэвіч паводле gazeta.pl**



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Нас чакае дыктатура пэнсіянэраў?**

# «Здароўе — гэта ўменьне жыць са сваёй хваробай»

Новы артыкул **Дар'і Ліс** з цыклу пра жыцьцё людзей з абмежаванымі магчымасьцямі.

У кожнага чалавека — свая энэргетыка. З кімсьці лёгка знаходзіцца побач і хутка зьяўляюцца тэмы для размовы, з кімсьці — наадварот. Са Сьвятланай — сьветла. Сонечна. Маленькая, кволая дзяўчына на калясцы, а колькі ж у ёй спакою і ўпэўненасьці!..

Мы п'ём каву, размаўляем. Размаўляем на розных мовах, дарэчы, але цудоўна адна адну разумеем. Жартуем — выходзіць своеасаблівы перакладніцка-лінгвістычны практыкум: сям'я Сьвятланы прыехала ў Беларусь з расейскага Тальяцці, і такую «порцыю» беларускай яна ўпершыню атрымала ад маёй сьціплай асобы. Сьвета сумуе па волскіх пэйзажах, па старых сябрах, але ўжо пасьпела палюбіць Беларусь.

Размаўляем пра жыцьцё, каханьне, сяброўства, працу, каву… Пра праблемы інвалідаў — таксама. Праз складанае захворваньне цягліцаў Сьвета перамяшчаецца толькі на інвалідным вазку, але гэта не перашкаджае ёй вучыцца, працаваць, мець шмат сяброў па ўсім сьвеце ды радавацца жыцьцю. Дзяўчына самастойна вывучыла нямецкую мову і мінулым летам разам са сваёй сям'ёй падарожнічала па Германіі (іх даўно запрашалі сябры).

**ДЛ: Што найбольш зьдзівіла і ўразіла цябе ў Нямеччыне?**

**Сьвятлана:** Зьдзіўляе колькасьць калясачнікаў на вуліцах і іх магчымасьць свабодна перамяшчацца ў прасторы — на тэрыторыі крамы, рэстарацыі або сярэднявечнага замка… Каляскі — таксам цуд тэхнікі. Напрыклад, пярэдняе сядзеньне аўто можа пераўтварыцца ў каляску для прагулак, а потым зноўку стаць часткай машыны.

**ДЛ: Ці можа чалавек зь цяжкай інваліднасьцю стаць незалежным ад сваёй хваробы?**

**Сьвятлана:** Адказваючы на гэта пытаньне, можна кнігу напісаць! Спачатку трэба акрэсьліць паняцьце незалежнасьці… Асабіста для мяне, характэрная прыкмета ўнутранай незалежнасьці — здольнасьць адкрыта выказваць свае погляды, перакананьні і жыць у адпаведнасьці зь імі. І… прыняцьце самой сябе. Спакойнае прыняцьце сябе, свайго цела, асаблівасьцей характару і здольнасьцей, разуменьне таго, што табе дадзена, а што — не. Думаю, што страх выказваць свае пачуцьці і няёмкасьць ад выказваньня сваёй фізычнай слабасьці — прыкмета менавіта залежнасьці. Адзін нямецкі доктар сказаў мне, што здароўе — уменьне жыць са сваёй хваробай… Да гэтага варта імкнуцца. Ня буду пералічваць прыклады, калі цяжка хворыя людзі дасягнулі ў жыцьці фінансавай незалежнасьці і жывуць актыўным, паўнавартасным жыцьцём… Не ва ўсіх так выходзіць і ня ў гэтых вонкавых атрыбутах — годнасьць чалавека… А ў чым? Кожны шукае адказ самастойна…



**Сьвятлана Маршчацкая**

1977 г. нар. Скончыла сярэднюю школу ў горадзе Тальяцці. Самастойна вывучала жывапіс, псыхалёгію, нямецкую мову. Скончыла міжнародныя курсы журналістыкі. Цяпер студэнтка 3 курсу Маскоўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту друку, факультэт кніжнай справы і рэклямы. Супрацоўнічае з Моладзевым цэнтрам Саюзу журналістаў Расеі. Жыве ў мястэчку Чысьць і любіць Беларусь.

**ДЛ: Хто можа дапамагчы чалавеку з прыроджанай або набытай інваліднасьцю знайсьці сваё месца ў жыцьці?**

**Сьвятлана:** Тут шмат залежыць ад бацькоў і сям'і. Калі нараджаецца дзіця зь цяжкім захворваньнем (а мэдыкі сьцьвярджаюць, што яно доўга не пражыве), спадарожнікам малечы часта становіцца безнадзейнасьць, наканаванасьць… Ня раз яму давядзецца сустракаць «спачувальныя» погляды чужых людзей — «Бедны! У яго няма будучыні…» Нават настаўнікі могуць не надаваць вялікага значэньня навучаньню дзіцяці-інваліда: маўляў, усё адно ён працаваць ня зможа і нічога не дасягне ў жыцьці. Такія рэчы не надаюць аптымізму, але, калі дома дзіця будзе сустракаць другое да сябе стаўленьне — падтрымку, сяброўства, любоў — усе цяжкасьці будуць пераадольвацца значна прасьцей, а шкадаваньне беднага дзіцяці зычліўцамі будзе ўспрынятае з усьмешкай. Людзі ж розныя сустракаюцца, камусьці даводзіцца даказваць звычайныя рэчы.

**ДЛ: У цябе цудоўныя бацькі, якія падтрымліваюць. Ты студэнтка Маскоўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту друку. Скажы, калі ласка, складана вучыцца дыстанцыйна?**

**Сьвятлана:** Для мяне гэта самы аптымальны варыянт навучаньня, таму што ня маю магчымасьці наведваць лекцыі праз стан здароўя і ў той жа час хачу атрымаць вышэйшую адукацыю. Перавага дыстанцыйнай формы навучаньня ў тым, што ты самастойна вызначаеш графік заняткаў — і наперад: усё з дапамогай кампутара і інтэрнэту. Думаю, дыстанцыйная вучоба — вельмі пэрспэктыўны накірунак, які будзе разьвівацца.

**ДЛ: Плянуеш працаваць па спэцыяльнасьці?**

**Сьвятлана:** А я ўжо працую: займаюся капірайтынгам і журналістыкай (завочна скончыла міжнародныя курсы журналістыкі). У асноўным гэта фры-ланс — мне замаўляюць артыкулы, прэс-рэлізы праз інтэрнэт, і я выконваю замовы. Добрая практыка! Мару стварыць свой часопіс і выдаць кнігу… Наагул, вельмі шмат задумак — і шмат працы. Яшчэ ёсьць сябры і блізкія людзі, а я ніколі не шкадую часу на зносіны і вельмі люблю новыя знаёмствы! Чалавек — кніга, у якую заўжды цікава зазірнуць…

**…Але ня кожную кнігу мы здольныя дачытаць - некаторыя ж перачытваем ня раз… Сьвятлане хочацца пазычыць ажыцьцяўленьня мараў і посьпеху ва ўсіх праектах, а галоўнае — заўжды заставацца сьветлым ліхтарыкам надзеі і любові, безь якіх немагчыма жыць.**

## Імпарт мабільнікаў і легкавікоў вырас

У Беларусі ў студзені — чэрвені бягучага году легальны імпарт мабільных тэлефонаў у параўнаньні з аналягічным пэрыядам 2006 г. узрос больш як у 2,5 разу. Імпартавана 184227 тэлефонаў на суму $19,768 млн. Найбольшая колькасьць мабільных тэлефонаў увозілася з Вугоршчыны — 73,4 тыс, Карэі — 44,89 тыс. і Кітая — 42,39 тыс. Таксама за шэсьць месяцаў у краіну ўвезена 96,1 тыс. легкавікоў на суму $540,4 млн., што ў 1,3 разу больш проці 2006 г.

## Мальцаў: «Пасадкі на дарогі стануць для нашых лётчыкаў звычайнымі»

На аўтамагістралі Брэст—Менск 4 жніўня зрабілі пасадку самалёты МІГ-29 і СУ-27, што базуюцца на 61-й зьнішчальнай авіяцыйнай базе. На «алімпійцы», між Івацэвічамі і Баранавічамі, ёсьць аэрадромны ўчастак дарогі. Ён адрозьніваецца толькі тым, што ня мае газону, які разьдзяляе палосы руху. На адпрацоўку пасадкі самалётаў прыбыў міністар абароны Л.Мальцаў. «Неўзабаве такія пасадкі стануць звычайнай справай», — заявіў ён.

## Лінія Міндоўга

15—16 верасьня на цэнтральнай пляцоўцы комплексу «Лінія Сталіна» будзе праходзіць III Міжнародны рыцарскі фэстываль «Беларусь сярэднявечная». Як кажуць, без камэнтароў.

## Майстар красамоўства

Традыцыйная нядзельная праграма кіраўніка Вэнэсуэлы Уга Чавэса «Алё, прэзыдэнт» пабіла ўсе рэкорды і доўжылася 7 гадзін 43 хвіліны. Чавэс закрануў самыя розныя тэмы і выканаў народную песьню.

## Жнівень прагназуецца сыры і цёплы

Надвор'е ў жніўні будзе няўстойлівым, а сярэдняя тэмпэратура чакаецца прыкладна на 0,5 градуса вышэй нормы, паведаміў Гідрамэтцэнтар. Не пашкадуе прырода дажджоў, якіх чакаецца прыкладна 125—130% ад нормы.

## Пілігрымка ў Росіцу

З Полацку ў Росіцу (Дрысенскі раён) — месца пакутніцкай сьмерці беларускіх ксяндзоў-марыянаў Антонія Ляшчэвіча ды Юр'я Кашыры — выйшла традыцыйная пілігрымка. У ёй бяруць удзел 80 вернікаў з Полаччыны, Віцебску, Лынтупаў. Сярод пілігрымаў 76-гадовая Тарэса Мілашэвіч, сьведка Росіцкай трагедыі.

## Нацыянальнасьць — жмудзін

Жмудзіны ў Літве змагаюцца за права існаваньня жмудзкай нацыянальнасьці. Віленчук Людвікас Рагаўскас абскардзіў у судзе рашэньне ЗАГСу, які адмовіў прызнаць яго жмудзінам. У Літве ўзьнікла таварыства пад назваю «Жмудзіны былі, ёсьць і будуць».

## Пчолы раззбройваюць мінныя палі

Пасьля вайны ў Харватыі засталося 250 тыс. мінаў. Навукоўцы з групы прафэсара Кежыча вучаць вусякоў знаходзіць выбухоўку, зьмяшчаючы невялікія порцыі тратылу ў кантэйнэры ля іх сталовак. Пасьля трэнінгу насякомыя пазнаюць пах зарадаў, і іх выпускаюць на тэставыя палі. Палёт рэгіструе тэрмавізійная камэра. Па запісах можна ідэнтыфікаваць месцы, дзе пчолы пачулі тратыл.

## Украінец — найвышэйшы ў сьвеце

Украінец Леанід Стаднік, чый рост складае 2 м 54 см, прызнаны новым уладальнікам тытулу самага высокага чалавека ў сьвеце. Рэкорд будзе зафіксаваны ў новым выданьні Кнігі рэкордаў Гінэса.

**СМ; інф. «Эўрарадыё», БЕЛТА, gazeta.pl, «Звязда»**




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Ірына Дарафеева выступае у вёсцы Насовічы (Добрускі раён).**



# Сустрэчы на радзіме Геніюш

Гарадзенская дэмакратычная моладзь арганізуе ў Зэльве першыя моладзевыя сустрэчы «Разам да Геніюш», прымеркаваныя да 97-е гадавіны з дня народзінаў слыннай паэткі. Сустрэчы пачнуцца 11 жніўня ў мястэчку Зэльва а 9-й раніцы ўрачыстай службай у Сьвята-Траецкай царкве. Затым усе ахвотныя змогуць сходзіць да магілы Ларысы Геніюш, прагучыць памінальная малітва і можна будзе пачуць прамовы вядомых людзей. Святкаваньне працягнецца на маляўнічым беразе Зэльвенскага вадасховішча. Ля вогнішча з намётамі чакаецца выступ паэтаў, запрошаныя вядомыя музыкі. Да ўдзелу ў мерапрыемстве запрашаюцца ўсе ахвотныя.

## ГОД ПАЭЗІІ

### АКСАНА СПРЫНЧАН

* * *

Пішу на каменьчыках літары,
шпурляю ў ваду.
Кругі, як жыцьцё, разыходзяцца —
– – – – – К – – – – –
– – – – – А – – – – – –
– – – – – Х – – – – –
– – – – – А – – – – –
– – – – – Ю – – – – –
– – – – – ? – – – – –
– – – – – Л – – – – –
– – – – – Ю – – – – –
– – – – – Б – – – – –
– – – – – Л – – – – – –
– – – – – Ю – – – – –
– – – – – ? – – – – –
І ў неба ўглядаюся вусьцішна,
што тоне ў вадзе.
А з моўчы глыбокай дыханьне
ці аблачыны,
ці рыбіны:
(ж)
(ы)
(в)
(у)
(!)
і
(ж)
(ы)
(в)
(і)
(!)
і
(ж)
(ы)
(в)
(е)
(!)

# Аршанская бітва—2007

Фэст беларускай аўтарскай песьні й паэзіі «Аршанская бітва—2007» мае адбыцца на Крапівенскім полі **8 верасьня.**

Фэстываль традыцыйна адбываецца на гістарычным месцы Аршанскае бітвы 1514 году — левым беразе Дняпра пры ўпадзеньні ў яго рэчкі Крапівенкі. Фэст пачынаецца а 20-й і доўжыцца ўсю ноч. Праходзіць ён на адкрытым паветры, таму варта падумаць пра адпаведную вопратку, запас ежы і намёт. Запас дроў для вогнішча будзе на месцы.

**Даезд:** з чыгуначнага вакзала на аўтобусе ці маршрутцы № 11 да аўтавакзалу (канец маршруту). Далей — аўтобусам «Ворша — Дуброўна» да прыпынку «Гацькаўшчына». Гуртам можна наняць маршрутку з чыгуначнага вакзалу проста да Гацькаўшчыны. Таксама аўтобусам або маршруткай можна ад'ехаць ад прывакзальнае плошчы да прыпынку «Цэнтар», затым ад Цэнтральнай плошчы, што ля «Дому гандлю» (прыпынак за помнікам Леніну) можна сесьці на аўтобус ці маршрутку «Ворша — Дуброўна» і ехаць да прыпынку «Гацькаўшчына». Ад прыпынку «Гацькаўшчына» да месца фэсту каля 1 км.

Спадарожныя цікавосткі**: па два бакі Цэнтральнае плошчы знаходзяцца музэй Уладзімера Караткевіча і Прыдняпроўскі парк з помнікам Караткевічу на месцы дому, дзе прайшло ягонае дзяцінства. У парафіяльным касьцёле Сьв.Язэпа (вул.Савецкая) экспануецца адзіная на Беларусі каляровая ксэракопія ў натуральны фармат вядомай карціны XVI ст. «Аршанская бітва» (арыгінал у Варшаве).**

**Даведкі:** (029) 291-62-38 (Юрка), (029) 319-65-74 (Генадзь), (029) 666-75-42 (Віктар).



# пра-бел / пра-сьвет

Эсэістыка • Крытыка • Рэфлексіі


**Беларусь у эўрапейскай салянцы.** Ці прынясе беларускай культуры карысьць сяброўства нашай краіны ў Эўрасаюзе?
Піша Алесь Кудрыцкі ........ 18

**Сьвет не загіне ад перанасяленьня.** У Эўропе адмірае інстытут шлюбу, у Амэрыцы ён моцны, у Афрыцы праз дзесяць гадоў спыніцца эпідэмія СНІДу, а ў Азіі — рост насельніцтва. Беларусі ж пагражае дэмакратура пэнсіянэраў і ўтрыманцаў.
Гутарка з польскім дэмографам Маркам Акульскім ........ 26

**«Здароўе — гэта ўменьне жыць са сваёй хваробай».**
Новы артыкул Дар'і Ліс з цыклу пра жыцьцё людзей з абмежаванымі магчымасьцямі ........ 29




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Чаму беларусы ня ўмеюць дзякаваць?**

Піша Янка Запруднік. **Старонка 22.**

## Грузія безь дзьвюхкосьсяў

Піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 16.**



## КАЛІ Б...




**...у інтэрнэце, адпаведна загаду, быў наведзены парадак.**

МАЛЮНАК І ТЭКСТ ЛЁЛІКА УШКІНА

## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

З акцябра 1905 году да юня 1907 году пагінула ад рэвалюцыі рознымі спосабамі 44,020 чалавек.

* * *

У Расеі ўсяго 46,000 народных вучыцялёў, зь іх 20,000 лішылі месца за рэвалюцыйны рух.

* * *

У наябры будуць прадавацца зь ліцытацыі 179 маёнткаў, купляных мужыкамі цераз «Красьцьянскі банк», усяго 469,400 дзесяцін.

**«НН». №29. 1907**




# А ты падпішыся!

**Каб рэгулярна атрымліваць «Нашу Ніву»,** проста падпішыце дамову. Дэталі — **старонка 17.**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ


### ВІТАНЬНІ

**Віншуем Андрэя і Вольгу Курэйчыкаў** з нараджэньнем сына. Хай гадуецца вялікі! Сябры

### ПАДЗЯКІ

**Сям'я Юр'я Юркаўца** дзякуе ўсім тым, хто быў у гэтыя цяжкія дні з намі, хто падтрымаў і дапамог

### КАНТАКТЫ

**Пазнаёмлюся зь людзьмі,** якія цікавяцца беларускім паганствам. paganism@tut.by

### ПРАДАЮ ХАТУ

**Танна прадам** цагляны прыватны дом 50 кв.м.(з участкам 0,05 га) за 10 хвілінаў хады ад менскай кальцавой. Падведзеныя сьвятло й вада. Ёсьць газавы балён ды печка. Газыфікацыя — да канца 2007 г. Тэлефануйце ў любы час дня й ночы: 8–029–576–74–29

### КНІГІ

**Кнігаабмен.** Дапамагу знайсьці патрэбную кнігу. Т.: 753–91–96



# Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| шэф–рэдактар | Андрэй Дынько |
| галоўны рэдактар | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| заснавальнік | Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша ніва» |
| выдавец | Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**.


Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 23.00 08.08.2007.

Замова № 4306.

Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.